ЛЕАНІД ЛАЎРЭШ

«СТАЯЎ НА ПАДМУРОЎЦЫ ПАНСКІ ДОМ...»

ЖЫРМУНЫ І ПАГАРОДНА

ЛЕАНІД ЛАЎРЭШ

«СТАЯЎ НА ПАДМУРОЎЦЫ ПАНСКІ ДОМ...»

Жырмуны і Пагародна

Издательские решения
По лицензии Ridero
2026

УДК 82-3
ББК 84
Л25

Шрифты предоставлены компанией «ПараТайп»

Лаўрэш Леанід

Л25 «Стаяў на падмуроўцы панскі дом...» : Жырмуны і Пагародна / Леанід Лаўрэш. — [б. м.] : Издательские решения, 2026. — 136 с.
ISBN 978-5-0071-4788-0

У кнізе расказваецца пра два старажытныя маёнткі гістарычнай Лідчыны — Жырмуны і Пагародна. Назва кнігі — радок з першай часткі паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш».

УДК 82-3
ББК 84

18+ В соответствии с ФЗ от 29.12.2010 №436-ФЗ

ISBN 978-5-0071-4788-0

© Леанід Лаўрэш, 2026

Між гэтых ніў калісьці, над ручом на ўзвышшы
ў бярозавым гаі, у дрэў густых зацішшы
Стаяў на падмуроўцы панскі дом драўляны:
Здалёк бялелі вокны, сцены і парканы.
Адам Міцкевіч

ЖЫРМУНЫ

ГІСТОРЫЯ ПАСЕЛІШЧА І ПЕРШЫЯ ЎЛАДАЛЬНІКІ

Ёсць меркаванне, што назва Жырмуны паходзіць ад рэчкі Жырмункі, якая тут працякае. Згадкі пра паселішча сустракаюцца ўжо ў дакументах пачатку XV стагоддзя.

Першымі ўладальнікамі маёнтка Жырмуны былі Ян і Юры (вядомы як Юрга) Бутрымовічы, верагодна, бацька і сын. Абодва — выбітныя асобы свайго часу.

Ян Бутрым з Жырмунаў уваходзіў у склад пасольства караля Ягайлы ў Прагу ў 1410 годзе. У 1413 годзе ў Гародле ён атрымаў герб «Тапор», а ў наступным годзе быў узведзены ў званне надворнага маршалка вялікага князя Вітаўта. У 1418 годзе быў дэлегатам Канстанцкага сабору, дзе ўзначальваў пышную світу Вітаўта.

Яшчэ больш прыкметную ролю ў гісторыі адыграў Юрга Бутрым з Жырмунаў — з 1428 года маршалак двара вялікага князя Вітаўта. Длугаш характарызуе яго як бывалага чалавека, які, правёўшы шмат гадоў за мяжою, меў моцны і кемлівы розум. Длугаш адзначае, што Юрга Бутрым пасля перамогі Жыгімонта Кейстутавіча над Свідрыгайлам настойліва раіў Кейстутавічу разарваць унію з Польшчай.

ПЕРАХОД МАЁНТКА ДА ІНШЫХ РОДАЎ

Недзе каля 1435 года Жырмуны перайшлі да жмудскага старасты Мантоўта. У 1542 годзе каралеўскія дваране Андрэй і Ян Якубавічы-Мантоўты спрачаліся са Станіславам Гаштольдам з-за маёнткаў Свінец і Жырмуны, якія тады належалі іх дзядзьку, кіеўскаму ваяводу Юрыю. На падставе пагаднення 1546 года з сястрой Марынай, жонкай Андрэя Ляшча-Стрэмялецкага, быў завершаны падзел воласці, паводле якога Андрэй атрымаў Салечнікі і Жырмуны, а на Валыні — Біскупічы. Ян жа атрымаў шэраг іншых маёнткаў, у тым ліку Млынаў і Пякалы на Валыні. Андрэй Мантаўт, вядомы таксама як Мантольд, быў жанаты з княжной Марыяй Гальшанскай.

У 1563 годзе маёнтак арандаваў троцкі ваявода і гетман вялікі літоўскі Мікалай Радзівіл Руды. Каля 1600 года мястэчка перайшло да Кезгайлаў-Завішаў. У 1624 годзе Ян Завіша, ваявода віцебскі і староста суражскі, у фундацыйнай грамаце, выдадзенай касцёлу ў Жырмунах, фігураваў як спадчынны ўладальнік Жырмунскага павета. З 1626 года (пасля смерці Яна Завішы) і да 1641 года Жырмунамі валодаў Мікалай Завіша, кашталян віцебскі, адзіны сын ваяводы.

У 1657 годзе, пасля смерці Яўстаха Завішы, сына Мікалая, паводле тастаменту яе мужа, Гальшка Мікалаева Завішына аддала маёнтак Жырмуны разам з запісанымі на ім 50 000 злотымі ў пацэсію (арэнду) сваёй пляменніцы Алене Тышкевічоўне, якая была замужам за Мікалаем Шамётам, суддзёй Жмудскім. Пасля смерці сужэнцаў Шамётаў Жырмуны разам са згаданым грашовым запісам перайшлі да іх нашчадкаў: старасты гінтынскага Міхала Шамёта, войскага лідскага Уладзіслава Шамёта, Крысціны Шамя-

тоўны (памерла незамужняй), Эльжбеты Шамятоўны (у замустве Франкевічавай, кашталянавай навагрудскай) і Мар'яны Шамятоўны (у замустве Белікавічавай). Пазней Жырмунамі валодалі Людвіка Шамятоўна, дачка Міхала, якая выйшла замуж за слонімскага падскарбія Казіміра Валовіча, і Ганна Шамятоўна, дачка Уладзіслава, якая выйшла замуж за Антонія Гузельфа.

Перад 1693 годам толькі што згаданыя Шамятоўны здавалі Жырмуны ў арэнду скарбніку ВКЛ і лідскаму гродскаму пісару Міхалу Казіміру Палевічу і яго жонцы Магдалене з Карызнаў.

У 1724 годзе Аўгуст II Моцны надаў Жырмунам Магдэбургскае права.

РАДЗІВІЛАЎСКІ ПЕРЫЯД

На пачатку XVIII стагоддзя Барбара Завішанка (1690–1762), дачка мінскага ваяводы Кшыштафа Завішы-Кейзгайлы, выйшла замуж за навагрудскага ваяводу Мікалая Фаўстына Радзівіла і як пасаг прынесла Жырмуны Радзівілам. Аднак княгіня Барбара Радзівіл з Завішаў, перш чым стаць поўнай гаспадыняй Жырмунаў, была вымушана судзіцца з Шамётамі, Валовічамі і Гузэльфамі.

Сужэнцы мелі чатырнаццаць дзяцей, з якіх да сталага ўзросту дажылі чатыры сыны і чатыры дачкі. Бацька Барбары пісаў у сваіх мемуарах: *«Мая першая дачка Барбара Францішка нарадзілася ў Мінску 3 снежня 1690 года. Кумам, ці хросным бацькам быў Яснавяльможны Пан Юры Сапега, стольнік ВКЛ, хроснымі маці — віленская ваяводзіна, гетманава ВКЛ ЯП Крысціна Сапега з Глябовічаў і віцеб-*

ская ваяводзіна ЯП Храпавіцкая». Дачка Кшыштафа Завішы-Кейзгайлы, Барбара Радзівіл, пасля смерці бацькі старанна сабрала ягоныя прамовы і выдала кнігу пад назвай «Водгук прыемных мелодый». У кнізе бацька паведамляе пікантныя падрабязнасці, напрыклад, як яго дачку сватаў князь Мікалай Фаўстын Радзівіл у 1710 годзе*: «Той бесперапынна налягаў на нас, каб мы аддалі дачку; нарэшце, на св. Барбару прыехаў да нас на імяніны ў госці, у той жа дзень нас прымусіў, каб мы далі яму вячэру і дзеля выканання яго жаданняў дазволілі, каб прыемную зведаў пасцель, у прысутнасці бліжэйшых паноў-суседзяў; усё гэта адбылося з вялікай цяжкасцю, бо нам не хацелася так неспадзявана выдаваць замуж і спраўляць вяселле, але паколькі ўжо так здарылася, хай Бог іх благаславіць»*. Мікалай Фаўстын дамогся права «першай шлюбнай ночы» ў прысутнасці паважаных сведкаў. Вось як! Але, здаецца, вяселле ўдалося, бо Завіша пакінуў у дзённіку запіс: *«Падчас таго вяселля, сапсаваўшы страўнік, я прапакутаваў пяць дзён»*.

Мікалай Фаўстын Радзівіл, дзедзіч Дзятлава і Бердычава, распачаў бердычава-жырмунскую лінію Радзівілаў, якая праіснавала некалькі пакаленняў.

Пасля яго Бердычаў і Жырмуны атрымалі ў спадчыну сын Мікалая Фаўстына Станіслаў (1722–1787), генерал-паручнік літоўскага войска, жанаты з Каралінай з Пацеяў, а потым яго ўнук Мікалай (1751–1811), шэф палка літоўскай коннай гвардыі, жанаты з Францішкай, графіняй Бутлер. Сужэнцы мелі дзвюх дачок: Юлію (у першым шлюбе Юдыцкая, у другім — замужам за Мацеем Радзівілам з Бердычава, у трэцім шлюбе за Аляксандрам Любамірскім) і Ганну (у першым шлюбе Нарбутава, у другім Храпавіцкая, у трэцім Лашкевічава), а таксама чатырох сыноў: Караля, Францішка, Міхала (палкоўніка, бацьку Марцаліны Чартарыскай, вучаніцы Шапэна) і Мікалая.

ЗАНЯПАД МАЁНТКА І ЗМЕНА ЎЛАДАЛЬНІКАЎ

У 1813 годзе частка Жырмунаў, менавіта тая, што належала Міхалу Радзівілу, была канфіскавана расійскай казной. Гэта стала адплатай за ўдзел Радзівіла ў кампаніі 1812 года. У 1828 годзе ўвесь маёнтак быў экспрапрыяваны, што прывяло да яго канчатковага заняпаду. Пасля паўстання 1830–1831 гадоў цэнтр маёнтка перайшоў у рукі сям'і Шванебахаў, а астатнія часткі былі падзелены.

Апошнім з роду Радзівілаў, хто валодаў Жырмунамі, быў сын Мікалая-старэйшага — Мікалай Радзівіл-малодшы (1791–1853), жанаты з Вікторыяй з Нарбутаў (†1855). Яны мелі дзяцей: Мікалая-Піліпа, Стэфанію, Ванду і Марыю. Марыя (1830–1902) у 1849 годзе выйшла замуж за Міхала Тышкевіча (1828–1897), другога Біржанскага ардыната, і прынесла Жырмуны яму як пасаг.

Вядома, што бердычаў-жырмунская лінія скончылася нейкім буйным скандалам.

Тышкевічы нядоўга заставаліся гаспадарамі Жырмунаў. Да пачатку XX стагоддзя яны належалі Ганне Шванебах, потым — яе сыну. У 1923 годзе Жырмуны набыў Аляксандр Мяйштавіч, грамадска-палітычны дзеяч і міністр юстыцыі Рэспублікі Польшча, які ў 1928 годзе прадаў іх Юзафу Друцкаму-Любецкаму. Лічыцца, што апошнімі ўладальнікамі маёнтка была сям'я Ельскіх.

Станіслаў Радзівіл

БУДАЎНІЦТВА СЯДЗІБЫ І КАСЦЁЛА

У гісторыі Жырмунаў Радзівілы засталіся дзвюма падзеямі — як заснавальнікі драўлянага касцёла, пабудаванага ў 1788 годзе паводле праекта іх прыдворнага архітэктара Яна Падчашынскага, вучня Гуцэвіча, і як стваральнікі рэзідэнцыі. Фундатар касцёла, князь Станіслаў Радзівіл, памёр у Жырмунах за год да яго завяршэння і быў пахаваны ў касцельных склепах. Верагодна, будаўніцтва палацавых будынкаў ён пачаў раней за касцёл, але гэты праект пакінуў нясканчаным. Да смерці Станіслава Радзівіла паспелі пабудаваць толькі афіцыны. Жыццё ў яго было бурнае: ён узначаліў партыю Радзівілаў у Наваградскім ваяводстве, Слонімскім, Ваўкавыскім і Лідскім паветах, адказваў за выбары радзівілаўскіх прыхільнікаў на мясцовых соймiках, ваяваў з прыхільнікамі Барскай канфедэрацыі. І таму, верагодна, ягоную смерць прыспешыла палітыка. Рэалізацыя праекта пабудовы сядзібы жырмунскай лініі Радзівілаў пачалася з гаспадарчых пабудоў і брамы, але сам палац так і не быў узведзены. Імя архітэктара гэтай недабудаванай і сціплай рэзідэнцыі таксама невядомае. Аднак можна выказаць здагадку, што адным з архітэктараў быў Ян Падчашынскі.

АПІСАННЕ ЖЫРМУНСКАГА ДВАРА (1784 ГОД). КАЛОНА І СТАТУЯ АРХАНЁЛА РАФАІЛА

У вопісах Лідскага дэканата 1784 года маецца дэталёвае апісанне Жырмунскага двара Радзівілаў, у якім згадваецца «статуя лідскага Рафала на мураваным слупе». З-за каштоўнасці тэксту прыводзім яго цалкам:

«Жырмунка (Zyrmunki), фальварак тых жа яснавяльможных ягамосцяў нязёў Радзівілаў, на захад чвэрць лёгкай мілі (ад парафіяльнага касцёла — *Л. Л.*).

Два двары: адзін мураваны палац (верагодна, адна з афіцын — *Л. Л.*), *каля гэтага палаца мураваная афіцына, дзве іншыя драўляныя афіцыны атынкаваныя. Другі двор эканомскі, гаспадарскі з гумнамі, лядоўнямі, вазоўнямі, пад імі мураваныя склепы. Абора драўляная. Стайня фабрычная пры гумне, трошкі ў поле — ветраны млын, які не меле. Ідучы ад эканомскага двара, па правай руцэ статуя лідскага Рафала на мураваным слупе, па левай руцэ драўляныя кашары з мураванымі слупамі пастаўленыя для прыслугі і розных рамеснікаў. Тут жа пры кашарах знаходзіцца вялікая аўстэрыя з рознымі выгодамі, насупраць яе знаходзіцца драўлянае з мураванымі слупамі збожжасховішча, пад ім мураваныя склепы і лядоўня.*

Мураваны двор з аднаго боку акапаны ровам стаіць над ставам. На гэтым ставе мураваны двухпавярховы млын, вакол млына дрэвы.

Мураваны бровар з усімі выгодамі, за ім будынак з усімі выгодамі для прачак. Ідучы да бровара, каля двара альховы гай, які мае назву Мамоўшчына, тут у прыгожым месцы, у перспектыве бачны мураваны агароджаны палац, у якім розныя выгоды: кухня, студня і г. д., у гэтым жа гайку чатыры драўляныя замкі: адзін для княжат, другі для князя-

палкоўніка, трэці для яснавяльможнага пана шамбеляна Шышкі, чацвёрты для бургграфа.

Павярнуўшыся ад двара, па правай руцэ бачны... муравaны з усімі выгодамі за ім сені, на гары будка, па левым баку бачна другая перспектыва: альтанка на два паверхі фарбаваная зялёнай фарбай, далей рэчка, адкуль вада з крыніц паступае да студні пад кухняй».

Акрамя жырмунскай, у Беларусі маецца яшчэ адна калона арханёла Рафаіла каля вёскі Скокі (зараз прыгарад Берасця). Яна пастаўлена ў маёнтку, дзе ў 1758 годзе нарадзіўся паэт і пісьменнік, ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі Юльян Нямцэвіч.

Польскія гісторыкі лічаць, што падобныя калоны ставіліся пры канцы XVIII ст. у гонар Канстытуцыі 3 Мая, зараз у Беларусі вядома 15 такіх калон. Але, як бачым, калона са статуяй «лідскага» Арханёла Рафаіла ў Жырмунах існавала ўжо ў 1784 годзе.

Загадкай з'яўляецца, чаму статуя звалася «лідскай» — можа, яе аўтар жыў у Лідзе? Але для гэтага майстар павінен быў быць знакамітым мастаком, і памяць пра яго захавалася б да нашага часу.

Другім, больш рэальным тлумачэннем, можа быць такое: да 1784 года калона з Арханёлам Рафаілам з нейкай нагоды атрымала значную вядомасць на Віленшчыне і стала звацца «лідскай», каб адрозніць ад іншых. Праз нейкі час калону маглі пачаць атаясамліваць і з ушанаваннем Канстытуцыі 3 Мая.

Вядома, што яшчэ доўга пасля 1945 года на калоне стаяла драўляная скульптура чалавека са скрыпкай, якога лічылі святым Янам. Людзі да нашага часу называюць поле каля калоны «полем пад св. Янам». Выбітны лідскі краязнавец і інжынер-будаўнік Станіслаў Ушакевіч дасканала вывучаў калону. Ён пісаў, што калона сур'ёзна рамантавалася; пра гэта сведчыць тое, што ў стары мур калоны ўмуравана шмат адносна новай цэглы меншага памеру (12 х

Калона ў Жырмунах

25 см). Магчыма, рамонт адбыўся пасля 1897 года, пасля адмены царскага ўказу, які забараняў будаваць і рамантаваць каталіцкія святыні.

Афіцыны ў Жырмунах да 1939 г.

Верагодна, тады ж на калону была пастаўлена і фігура св. Яна.

АРХІТЭКТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АФІЦЫН

Гаспадарчыя пабудовы (флігелі ці афіцыны), якія захаваліся да 1939 года, выглядалі сціпла і былі пашкоджаны падчас Першай сусветнай вайны. Размешчаныя па абодва бакі ад уваходнай брамы, яны павернуты фронтам да месца, дзе меўся быць пабудаваны палац. Абедзве мелі форму прастакутніка з невялікімі падмуркамі. Двухпавярховыя, са значна ніжэйшым першым паверхам з рустыкай і высо-

кім верхнім з гладкім фасадам. На франтальных фасадах абодвух будынкаў пілястры аддзялялі цэнтральную частку, імітуючы рызаліт, увянчаны трохвугольным франтонам з васьмігранным акулюсам. На кутах будынка таксама меліся пілястры. Магчыма, з-за пажару правая афіцына страціла франтон.

Абедзве афіцыны мелі высокія, крытыя гонтай вальмавыя дахі з двума масіўнымі атынкаванымі комінамі, размешчанымі сіметрычна на канцах канька.

Інтэр'ер правай з афіцын не меў ніякіх цікавых асаблівасцей. Аднак у левай інтэр'ер пакояў і залаў на верхнім паверсе быў нечакана багатым. Паколькі інтэр'еры афіцын звычайна былі сціплымі, магчыма, пасля продажу Дзятлава свайму зяцю Станіславу Солтану, князь Станіслаў Радзівіл часова пасяліўся ў ёй пасля таго, як афіцына належным чынам для яго была падрыхтаваная. Таму, верагодна, левая афіцына ў апісанні 1784 года названая палацам. Смерць перашкодзіла Станіславу Радзівілу пабудаваць палац, яго сын і наступныя ўладальнікі жылі пераважна ў Бердычаве і таксама не імкнуліся да рэалізацыі гэтага праекта.

На жаль, мастак, які спраектаваў ляпніну, мармуровыя каміны і сталярныя вырабы ў левай афіцыне, нам невядомы. Аднак бачна, што інтэр'ер левай афіцыны і праект інтэр'ера непабудаванага палаца былі створаны адным і тым жа мастаком, ці, магчыма, групай мастакоў, якія таксама рабілі інтэр'еры палаца ў суседнім Гародна, які будаваўся прыблізна адначасова з Жырмунскім.

Жырмунская афіцына магла быць нават ранейшай за палац у Гародна, бо ў той час як палац меў ужо рысы класіцызму, некаторыя дэкаратыўныя элементы ў Жырмунах (такія як форма падвойных дзвярэй і крэмава-залатыя лакіраваныя панелі) яшчэ насілі выразны адбітак ракако. Упрыгожванні ў левай афіцыне пакрывалі не толькі сцены, карнізы і столі, але і глыбокія аконныя праёмы масіўных

Супрапорты ў адным з пакояў, да 1939 г.

вонкавых сцен будынка, аконныя панелі і супрапорты[1]. Вялікія люстэркі, размешчаныя паміж вокнамі, былі ўстаўлены ў багатыя рамы. Паверхні сцен, не занятыя ляпніной, калісьці пакрывалі вытанчаныя ядвабныя тканіны. Пад столяю аднаго з пакояў праходзіў карніз у выглядзе густога кветкавага пляцення з меандравымі арнаментамі. У прамавугольных супрапортах месціліся медальёны, на блакітным фоне якіх мацаваліся жоўта-крэмавыя камеі з малюнкамі алегарычных сцэн. Падобныя медальёны, таксама з алегарычнымі матывамі, вянчалі рамы люстэркаў. Месцы над вокнамі пераважна ўпрыгожваліся ляпні-

[1] Супрапорта — пластычна апрацаваны ўчастак сцяны паміж дзвярной рамай і столлю, запоўнены рэльефам ці жывапісам.

най у выглядзе гірлянд з раслін, кветак і садавіны. Падобныя гірлянды пакрывалі некаторыя часткі карнізаў. Яшчэ адным матывам, які паўтараўся, былі прыгожыя пейзажы ў авальных рамах. Цэнтр столяў займалі круглыя разеткі, стылізаваныя пад лісце і акружаныя галінкамі хмызняку. Абкладзеныя мармурам каміны былі ўпрыгожаны ў стылі класіцызму.

УЯЗНАЯ БРАМА Ў ДВОР ЖЫРМУНЫ

Уязная брама, даўжынёй прыблізна 10 і глыбінёй 3 метры, прызначалася для размяшчэння адносна невялікай бібліятэкі ці, магчыма, толькі архіва.

Па абодва бакі ад яе высокага, шырокага і паўкруглага праёму знаходзіліся пары прысценных калон, якія падтрымлівалі антаблемент і трохкутны франтон, апраўлены карнізам. У ніжняй частцы, паміж калонамі, меліся скляпеністыя нішы, прызначаныя для статуй. Уваход у будынак брамы быў з правага боку. Ад дарогі да брамы вяла алея ліставых дрэў. Даволі шырокі ландшафтны парк са змешанымі дрэвамі, цалкам закінуты ўладальнікамі пасля Першай сусветнай вайны, у той час ужо цалкам здзічэў і страціў свой першапачатковы план.

Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя маёнтак Жырмуны меў амаль што 20 000 гектараў, у тым ліку 6615 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў. У міжваенны перыяд плошча маёнтка значна скарацілася.

Уязная брама ў двор Жырмуны

КАСЦЁЛ І ПАРАФІЯЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Жырмунская парафія была заснавана да 1437 года, калі ў ёй згадваецца ксёндз Ян з Коўні. Дакументаў аб заснаванні парафіі не захавалася, таму цяжка вызначыць, каму належыць заслуга яе стварэння: Бутрымам ці Кучукам. Парафія не згадваецца ў найстарэйшым спісе касцёлаў Віленскай дыяцэзіі, складзеным у 1522 годзе айцом Янам Альбінусам, але ўказана ў падатковых спісах 1553–1559 гадоў, калі належала да так званага Трокскага ключа. У падрыхтаваным з нагоды дыяцэзіяльнага збору рэестры 1669 года Жырмуны ўключаны ў Лідскі дэканат. Іншых звестак пра першы касцёл у Жырмунах няма.

У сярэдзіне XVI стагоддзя касцёл лічыўся адносна бедным. Вельмі верагодна, што парафія неўзабаве стала кальвінскай, бо ў 1563 годзе Мікалай Радзівіл перадаў у вечную арэнду будынкі і землі жырмунскай алтарыі свайму слугу Яну Зыхневічу. Магчыма, што рымска-каталіцкі прыход на нейкі час знік, хоць гістарычных запісаў на гэты конт няма.

Аднак ускосным сведчаннем з'яўляецца аднаўленне яго фундушу, зробленае 16 мая 1624 года віцебскім ваяводам Янам Завішай і яго жонкай Анастасіяй Трызнянкай. Яны надалі новаму касцёлу вёску Скавароды з дванаццацю падданымі і некалькі валок у саміх Жырмунах, а таксама для алтарыі[1] Святога Антонія — зямлю, вядомую як Ваганоўшчына. У 1660 годзе касцёл стаў ахвярай рабавання маскоўскіх войскаў. У 1690 годзе лідскі харунжы Тэафіл Кунцэвіч завяшчаў алтарыі 3000 злотых; у 1692 годзе завяшчанне пацвердзіў яго сын Канстанцін Казімір, лідскі чашнік.

У 1666 годзе ксёндз Мацей Шаркевіч пабудаваў новы драўляны касцёл і сваім тастаментам у тым жа годзе пакінуў 350 злотых на рамонт даху, шыбаў і на службы ў касцёле. 4 лістапада 1673 года віленскі суфраган, біскуп Мікалай Слупскі асвяціў новы касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі і Святога Яна Хрысціцеля. У разьбяным, часткова пазалочаным і маляваным у розныя колеры галоўным алтары знаходзіўся цудатворны абраз Маці Божай Ларэтанскай[2] і воты каля абраза — 119 сярэбраных пласцінак і ланцужкоў, пэрлы, пярсцёнкі і сярэбраныя ягняты. У верх-

[1] Алтарыя, гэта такі тып фундацыі, калі нехта даруе царкве алтар і грошы на ўтрыманне святара.

[2] У прыморскім горадзе Ларэта маецца самы вядомы ў Італіі Марыйны санктуарый. З XIII ст. у гэтым горадзе на Адрыятычным узбярэжжы знаходзіцца дамок з Назарэта, у якім нарадзілася Маці Божая і ў якім арха-

нім ярусе алтара знаходзіўся абраз святога Казіміра. З боку евангелля стаяў бакавы алтар з абразам Бічавання Хрыста, намаляваным на блясе, з другога боку — алтар святога Антонія Падуанскага.

У табернакуле гэтага алтара захоўваўся сярэбраны рэліквіярый[3] у форме крыжа з кропляй крыві Хрыста — рэліквія, набытая ў папы Урбана VIII віленскім біскупам Ежы Тышкевічам і ахвяраваная 20 сакавіка 1667 года яго сястрой, Гальшкай Мікалаевай Завішынай (жонкай Мікалая Завішы, з роду Тышкевічаў, памерла 15 красавіка 1667 года). У памяць пра ахвярадаўцу, дзякуючы намаганням Хэлены Шамётавай з Тышкевічаў, былі выраблены дзве алавяныя таблічкі, размешчаныя па баках алтара. На адной з іх — тэкст дакумента, падрыхтаванага пасля перанясення рэліквіі ў Жырмунскі касцёл, а на другой — эпітафія: «Люстэрка цноты і памяць пра славу ЯВ Мосці Брэсцкай ваявадзянкі Альшкі Тышкевічоўны Мікалаевай Завішынай, жонкі віцебскага кашталяна». Вопіс 1700 года паведамляе, што галоўны алтар меў форму канфесіянала[4]. Цудадзейны абраз Маці Божай Ларэтанскай, які там знаходзіўся, тады быў упрыгожаны блакітнымі атласнымі шатамі, а над галавой Марыі меўся надпіс сярэбранымі літарамі: «Nigra sed

---

нёл Габрыэль звеставаў ёй Добрую навіну аб цудоўным зачацці Хрыста. Паводле падання, дамок Марыі ў Ларэта перанеслі са Святой Зямлі анёлы.

[3] Табернакль — збудаванне ў алтары для захоўвання прадметаў рэлігійнага пакланення ці куфар са Святымі Дарамі. Рэліквіярый, ёмішча для захоўвання каштоўных рэліквій, якія маюць сакральнае значэнне.

[4] Канфесіянал — спавядальня (ад лац. confessio — споведзь), закрытае з усіх бакоў крэсла з дзверцамі, прызначанае для святара, які здзяйсняе сакрамант пакаяння. Да бакавых сценак канфесіянала далучаюцца спецыяльныя прыступкі-кленчнікі для вернікаў, якія спавядаюцца праз закрытыя кратамі акенцы.

formosa». У 1729 годзе тагачасны эканом і арганіст скраў і прадаў мясцовым яўрэям касцельнае срэбра, у тым ліку паціны[1] і таблічкі-воты з абраза Маці Божай, за што гарадскім судом у Лідзе быў прысуджаны да спалення на вогнішчы.

У інвентары 1731 года згадваецца яшчэ адзін алтар з выявай святога Францішка Ксаверыя. Падрабязны інвентар сярэбранага посуду ўключаў: пазалочаную манстранцыю, цыборый[2], тры келіхі з пацінамі, рэлікварый з кропляй крыві Хрыста і сем іншых рэліквіярыяў, шаты і кароны на алтарах, а таксама 47 вотыўных таблічак і шматлікія пацеркі, пярсцёнкі, каралі і пэрлы на абразе Найсвяцейшай Панны Марыі. Мелася трынаццаць арнатаў розных колераў. Падлога і сцены касцёла былі адрамантаваны.

Неўзабаве гэты касцёл быў заменены іншым, таксама драўляным, пад тытулам Адшукання Святога Крыжа. У 1739 годзе новы касцёл быў яшчэ недабудаваны. У ім знаходзіліся тры алтары, перанесеныя са старога касцёла — галоўны з цудатворным абразам Маці Божай Ларэтанскай і святога Казіміра. Сярэбраныя, часткова пазалочаныя шаты на абразе Панны Марыі з немаўлём важылі 15 грыўняў, сярэбраная карона абраза была інкруставана каштоўнымі камянямі. Побач з абразам стаялі два сярэбраныя анёлы з падсвечнікамі і віселі воты — 12 вялікіх і 28 меншых. У новы касцёл перанеслі два бакавыя алтары — святога Антонія і бічавання Хрыста. У касцёле знаходзіліся чатыры канфесіяналы і хрысцільня, а таксама

[1] Паціна — посуд у форме талеркі для еўхарыстыйнага хлеба.

[2] Манстрацыя — дараносіца, спецыяльны посуд для Святых Дароў, якую выкарыстоўваюць каб здзейсніць Сакрамант сабаравання цяжкахворых. Цыборый — драўляная альбо металічная скрынка (дараносіца) пасярэдзіне прастолу ў якой захоўваецца дараносіца з запаснымі Святымі Дарамі.

згадваўся хор для музыкаў, якія ўдзельнічалі ў набажэнствах. Са старога касцёла было перанесены літургічнае начынне: сасуды, шаты і іншыя дробныя рэчы. Таксама меліся наступныя прадметы: упрыгожаныя трыма рубінамі шаты і двухбаковыя сярэбраныя пазалочаныя таблічкі з надпісамі IHS і MARYA.

Да 1777 года касцёл быў знішчаны пажарам, у выніку якога згарэў цудатворны абраз Маці Божай Ларэтанскай. Коштам літоўскіх падкаморых Станіслава і Караліны з Пацеяў Радзівілаў, верагодна, ужо ў 1778 годзе была пабудаваная часовая «шопа», апісанне якой ёсць у візітацыі 1782 года. «Шопа» мела тры дзверы і восем вокнаў. Падлога ў ёй і ў сакрыстыі была зроблена з абпаленай цэглы, якая засталася ад папярэдняга касцёла, з-за чаго была нестабільнай і ўвесь час патрабавала рамонту. Пад «шопай» знаходзіліся дзве крыпты — адна часоў фундацыі Завішаў, другая, меншая — Радзівілаў. У аддзеленым драўлянымі кратамі прэзбітэрыі[1] знаходзіліся тры алтары. У галоўным алтары меўся зноўнамаляваны абраз Маці Божай Ларэтанскай з пазалочанымі сярэбранымі шатамі і каронай ад згарэлага абраза. У левым бакавым алтары знаходзіўся абраз Панны Марыі з немаўлём, а ў правым — укрыжаванне, падарунак Эльяша і Францішкі Жалкоўскіх. Справа ад галоўнага алтара вісеў стары вялікі абраз Панны Марыі, намаляваны на палатне. З боку евангелля амбонам служыла дубовая кафедра «выдатнай сталярнай працы», пазычаная Радзівіламі з Жырмунскага палаца. Арган, набыты пробашчам Кяневічам для папярэдняга касцёла, патрабаваў рамонту, які выканаў віленскі арганмайстар Павел Герхардт

[1] Прэзбітэрый ці прэзбітэрыюм — («месца для выбраных», ад старагрэчаскага «сход святароў») частка каталіцкага храма між асноўным аб'ёмам і алтарнай апсідай, прызначаная для царкоўнага кліра.

Зэле. У касцёл вярнуліся выратаваныя рэчы: манстранцыя, пацыфікал з кропляй крыві Хрыста, чатыры келіхі, пяць пацінаў, пушка, пара ампулак, срэбраны крыж, дзве кароны, чатыры рэліквары і іншыя прадметы. Акрамя таго, ад пажару было выратавана пятнаццаць арнатаў і да 1782 года набыта яшчэ два. Гэты часовы касцёл служыў вернікам да 1788 года, калі быў пабудаваны цяперашні касцёл.

СУЧАСНЫ ЖЫРМУНСКІ КАСЦЁЛ

Сучасны Жырмунскі касцёл, пабудаваны ў 1787–1788 гадах і асвечаны ксяндзом-пробашчам Францішкам Высоцкім у гонар Адшукання Святога Крыжа, быў фундаваны жонкай Станіслава Радзівіла, літоўскай падкамарынай Каралінай з Пацеяў. Згодна з вопісам 1796 года, будынак быў *«вельмі прыгожы з-за дрэва, вокнаў, даху і ўсяго ўнутранага ўбрання»*, але яго падмурак і цагляныя калоны фасада былі *«з нікчэмнага матэрыялу»*, верагодна, з цэглы згарэлага касцёла. На шчыце фасада, абапал дзвюх вежачак, былі выразаныя, месцамі пазалочаныя гербы Радзівілаў і Пацеяў, а таксама таблічка з пазалочанымі металічнымі літарамі: *«Усемагутнаму Богу MDCCLXXXVIII»*. Дах пакрыты гонтай, бляшаныя дахі вежачак пафарбаваны ў чырвоны колер. У прэзбітэрыі стаялі тры мураваныя алтары з калонамі і абразамі — на галоўным алтары Укрыжавання, на бакавых — Уваскрэсення і Унебаўзяцця. У капліцы Маці Божай знаходзіўся таксама мураваны чацвёрты алтар з ляпнымі ўпрыгожаннямі, тут мелася два абразы: на галоўным полі — Маці Божая з немаўляткам, упрыгожа-

ны пазалочанымі сярэбранымі шатамі, на верхнім ярусе — абраз Святой Барбары. Пры ўваходзе ў касцёл, прама на падлозе, стаяў прыгожы і вялікі арган. У касцёле былі новыя лаўкі і тры канфесіяналы. Сярод літургічнага начыння меліся манстранцыя, цыборый, чатыры келіхі, пяць пацінаў і два пацыфікалы (крыжы, у тым ліку вышэйзгаданы з кропляй крыві Хрыста). Калякасцельныя могілкі акружала сцяна з цаглянай брамай і чатырма невялікімі каплічкамі па кутах, прызначанымі для алтароў падчас працэсіі Божага Цела.

Да 1801 года да цудадзейнага абраза Маці Божай было дададзена 25 новых вотыўных таблічак, а таксама дзве невялікія, намаляваныя на метале выявы Маці Божай і Святога Антонія з дзіцем. У той час у капліцы знаходзіўся партрэт Караліны Радзівіл з Пацеяў.

Хораў усё яшчэ не было, і таму арган стаяў на падлозе. Амбон сталярна-сніцарскай работы быў пафарбаваны ў белы колер, а каля дзвярэй стаяў выдзеўбаны камень для святой вады. Згадвалася цагляная крыпта пад галоўным алтаром, закрытая падвойнымі дзвярыма. У 1813 годзе Агата Іванчава ахвяравала сярэбраную карону, інкруставаную каменьчыкамі, для абраза Найсвяцейшай Панны Марыі. У 1828 годзе на хорах ужо быў усталяваны арган, меўся абраз Святога Яна і драўляная хрысцільня. У 1830 годзе жырмунскі адміністратар падмураваў касцёл, месцамі паклаў цагляную падлогу і набыў ферэтрон (насілкі) з абразамі Найсвяцейшай Панны Марыі і Святога Пятра на блясе. У 1848 годзе, дзякуючы намаганням пробашча Яна Наркевіча, абраз у галоўным алтары быў заменены на скульптуру Укрыжаванага Хрыста, набытую ў францысканскім касцёле ў Гальшанах.

Да 1861 года касцёл адрамантаваны: сцены ўмацаваны, столь пакрыта дошкамі, а над шчытам фасада надбудавана вежачка, якая стаіць і сёння. З капліцы Маці Божай прыбраны драўляны пабелены алтар з выявай Маці

Божай Ружанцовай, а на галоўным алтары з'явіліся драўляныя скульптуры святога Станіслава і святога Казіміра. Сярод абразоў згадваецца выява Укрыжаванага Хрыста, якая вісела над дзвярыма сакрыстыі, а таксама два абразы ў сакрыстыі, якія апісваюцца як старыя: святой Тэрэзы і Перамянення Пана. Таксама згадваюцца два партрэты сям'і Пацеяў і ферэтрон з абразамі Маці Божай Ружанцовай і святога біскупа Адальберта. Паміж 1879 і 1888 гадамі фігуры святога Казіміра і святога Станіслава былі перанесены ў капліцу Маці Божай, куды ў 1888 годзе далі шэсць сярэбраных падсвечнікаў (ахвяра Караля Стэцэвіча) і жырандолю (ад Сікорскай).

У 1892 годзе, дзякуючы намаганням пробашча ксяндза Бальцэвіча, быў зроблены новы дах і пабудавана каменная агароджа. У 1893 годзе на ахвяраванні парафіян набыта восем харугваў, праз год — дзве металічныя тарчы з манаграмамі IHS і MARYA. У 1898 годзе Караль Стэцэвіч фундаваў пасярэбраны працэсійны крыж. За кошт сям'і Пузылевічаў былі замоўлены рэплікі карцін Уваскрэсення і Унебаўзяцця для бакавых алтароў, выкананыя віленскім мастаком Юзафам Балзукевічам.

У канцы XIX стагоддзя касцёл быў ужо занядбаны і нават «брудны». 1 чэрвеня 1912 года ад маланкі загарэўся дах, але яго хутка адрамантавалі.

КАСЦЕЛЬНЫЯ ІНСТЫТУЦЫІ І ПАБУДОВЫ

Ружанцовае брацтва пры касцёле ў Жырмунах было заснавана ў 1739 годзе дзякуючы Войцеху Стэцэвічу і пашырана ў 1747 годзе Станіславам Радзівілам. Да пажару касцёла каля 1777 года брацтва дынамічна працавала, але пазней прыйшло ў заняпад, як напісана ў візітацыі 1782 года, і праіснавала да 1863 года.

Першы шпіталь пры касцёле пабудаваны ў 1624–1666 гадах ксяндзом-пробашчам Мацеем Шаркевічам. У 1739 годзе шпіталь быў ужо стары і выглядаў як руіны. У 1757 годзе шпіталь атрымаў грошы ад Станіслава і Караліны Радзівіл з Пацеяў, у 1781 годзе быў грунтоўна адрамантаваны і пашыраны. Чарговы будынак шпіталя пабудаваны ў 1924–1928 гадах, але не выконваў сваіх традыцыйных функцый, бо ў ім жылі арганіст і эканом, а таксама мелася парафіяльная зала.

Прывілей 1624 года прадугледжваў, што пробашч павінен утрымліваць парафіяльную школу, але першыя згадкі пра яе існаванне датуюцца 1782 годам, наступныя — 1804 і 1805 гадамі. Школа квітнела ў перыяд 1826–1831 гадоў, аднак пасля паўстання была зачынена ўрадам.

Першыя згадкі пра званіцу (1731, 1739 гады) сведчаць пра тое, што яна была драўлянай, двухпавярховай, месцілася над уваходнай брамай на царкоўныя могілкі. У 1849 годзе на ёй знаходзіліся два званы, адзін з якіх з надпісам: *«Soli Deo Gloria | Me fecit I.C. Copinus Regiomonti | Stanisław Książę Radziwiłł Podkomorzy W.X.L. r. 1777»*. У 1796 годзе званіца апісвалася як старая, *«зробленая ў выглядзе крыжа»* і крытая дошкамі. У 1820 годзе падобную званіцу ўзвёў пробашч Станіслаў Шафкоўскі, а другую — у 1861 годзе ксёндз Ежы Данілевіч. Сучасная званіца была

пабудавана ў 1894 годзе цесляром Мацеям Балінам. Падчас Першай сусветнай вайны старыя званы вывезены ў Расію. У 1927 годзе Ганна і Антоні Рынгевічы фундавалі новы звон вагай 80 кг. У 1928 годзе занатаваны тры званы, а ў 1939 годзе — два невялікія, магчыма, ідэнтычныя тым, што захаваліся да нашых дзён.

Плябанія, пабудаваная ў 1631 годзе, была драўлянай і сціплай — на два пакоі, з саламяным дахам, як і іншыя гаспадарчыя пабудовы. Каля 1762 года парафіяльны ксёндз-пробашч Ян Кяневіч пабудаваў новую, значна большую плябанію на шэсць пакояў, якая стаяла да 1928 года. Дзякуючы намаганням парафіян і пробашча Стэфана Вержбоўскага, тады пачалося будаўніцтва новага будынка, які стаіць і сёння. Яго праект распрацаваў Ф. Урбшыс, а сталярнымі работамі займаўся Казімір Гаўрылаў з Вільнюса. Да 1939 года будынак практычна завершаны. Плябанія мела дзевяць пакояў, кухню і падсобныя пакоі на першым паверсе, а таксама жылое гарышча.

У справаздачы аб візітацыі 1820 года згадвалася, што ў полі за паўвярсты ад касцёла знаходзіліся асвечаныя магілы. У 1862 годзе лідскі дэкан Дыянізі Хлявінскі[1] (адзіны, былы ксёндз-філарэт) асвяціў там новыя могілкі. У 1904–1906 гадах, дзякуючы намаганням тагачаснага пробашча парафіі, ксяндза-каноніка Баляслава Сперскага, парафіяльныя могілкі былі абнесены цаглянай агароджай. У 1933 годзе ксёндз Браніцкі меў намер адрамантаваць агароджу могілак. Для гэтага Юліян Лясковіч, уладальнік суседняга маёнтка Пянткаўшчына, ахвяраваў футры сібірскіх лісіц і чорных паўночных аленяў, якія прадалі

[1] Пра яго гл: Лаўрэш Леанід. Ксёндз Дзіянісій Хлявінскі, філамат // Навагрудчына ў гістарычна-культурнай спадчыне Еўропы (да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы). 2010. С. 172–175; Лаўрэш Леанід. Лідскі дэкан — філамат, ксёндз Дзіянісі Хлявінскі // Лідскі Летапісец. 2018. №3 (83). С. 7–10.

Каля касцёла ў Жырмунах, 1915 г.

за 130 злотых. У 1939 годзе сцяна (прыкладна 600 метраў) была накрыта добрым цэментным дашкам.

СПІС ПРОБАШЧАЎ

Спіс жырмунскіх пробашчаў, падрыхтаваны на падставе даступных матэрыялаў, выглядае наступным чынам: Мацей Шаркевіч (1624–1666), Уладзіслаў Макоўскі (1666–1668), Мацей Алойзі Кунцэвіч (1668–1686), Лукаш Бецінус Лакатэлі (1686–1696), Мацей Віткоўскі (1696–1720), Ян Пшалгоўскі (1721–1739), Станіслаў Антоні Унгер (1739–

1756), Якуб Кабыленскі (1757–1759), Ян Кяневіч (1759–1786), Францішак Брунон Адраванж Высоцкі з Кужан (1786–1813), Станіслаў Шафкоўскі (1813–1827), Юзаф Каласанты Самкоўскі (1827–1833), Ян Наркевіч (1833–1850), Ежы Данілевіч (1850–1861), Тамаш Шаманскі (1862–1877), Зыгмунт Касцян (1877–1879), Рамуальд Стэцэвіч (1879–1882), Маўр Івашкевіч (1882–1890), Клаўдзій Антонавіч (1890–1891), Генрык Бальцэвіч (1891–1903), Фелікс Гарбатовіч (1903–1904), Баляслаў Сперскі (1904–1907)[1], Юзэф Зэра (1907–1909), Зыгмунт Чаркоўскі (1909–1911), Адам Сакалоўскі (1911–1921), Ігнацы Эйнер (1921–1924), Стэфан Аляксандр Вяржбоўскі (1924–1928), Ігнацы Браніцкі (1928–1948), Вацлаў Бекіш (1956–1964), Станіслаў Пацына (1988–1995), Генрык Яблонскі (1995–1999).

ЛЁС КСЯНДЗА ГЕНРЫКА БАЛЬЦЭВІЧА

Пра жырмунскага пробашча Бальцэвіча я раскажу праз мантаж тэкстаў розных аўтараў з маімі невялікімі дадаткамі.

Міхал Шымялевіч у 1937 годзе надрукаваў і пракаментаваў у «Лідскай Зямлі» красамоўныя фрагменты са скандальнай кнігі ксяндза Бальцэвіча, якая выпадкова патрапіла яму ў рукі. Ён пісаў:

[1] Пра яго Гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. Гродна, 2017. С. 30.

«Нядаўна адміністрацыя гарадской бібліятэкі ў Лідзе, упарадкоўваючы свой кнігазбор, адабрала, як кажуць, цэлы воз рознага непатрэбнага кніжнага смецця — відавочна, шкоднага для моладзі і дарослых — і, прыгаварыўшы да аўтадафэ, часова пакінула гэтыя кнігі ў кутку. Тым часам наш паважаны рэдактар (рэдактар «Лідскай зямлі» Уладзіслаў Абрамовіч — Л. Л.), які ўсім цікавіцца і ўсё можа здабыць, выпадкова натрапіўшы на гэтыя кнігі, запусціў у іх рукі і вылавіў смутную кнігу, якую памятаюць старыя людзі, але не ведае моладзь. Мушу адзначыць, што першае выданне гэтай кніжкі было надрукавана ў Львове ў 1900 годзе. У прадмове да другога выдання выдавец пісаў: «Калі фактычны бок лістоў зараз ужо не надта цікавы, дык ідэйны бок іх заўсёды актуальны». Аўтар лістоў не падаў ні свайго імя, ні прозвішча. Верагодна, ён быў рыма-каталіцкім ксяндзом. Арыентуючыся па ўзгадваных у лістах геаграфічных назвах: Вільня, Ашмяны, Эйшышкі, Ліда, Гародня, Беласток, — можна выказаць здагадку, што аўтар жыў і пісаў дзесьці на Лідскай зямлі. І таму для нас, жыхароў гэтай зямлі, кніга мае пэўную цікавасць.

Не магу ўтрымацца ад таго, каб падзяліцца з чытачамі «Лідскай зямлі» некалькімі старонкамі гэтай смутнай кнігі. Хай старыя ўспомняць, а маладыя даведаюцца, як гэта было сорак гадоў таму...»[1].

Тады ж рэдактар «Пшэглёнда Віленскага» Людвік Абрамовіч надрукаваў у сваёй газеце наступны артыкул:

«У №12 «Лідскай Зямлі» знаўца гісторыі лідскага павета п. Міхал Шымялевіч змясціў цікавы рэтраспектыўны артыкул пад назвай «Са старой кніжкі», у якім маецца шэраг

[1] Гл: Szymielewicz Michał. Ze starej książki // Ziemia Lidzka. 1937. №12. S.140–142; Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019. С. 131—134.

фрагментаў з выдадзенай больш за 30 гадоў таму брашуры экс-ксяндза віленскай дыяцэзіі Генрыка Бальцэвіча, зараз ужо старога чалавека, які жыве недзе ў Лідскім павеце.

Першае выданне згаданай брашуры «Касцельныя стасункі ў Літве: адкрытыя лісты ксяндза да ксяндзоў» выйшла ў Львове ў 1900 годзе, другое — у Мюнхене ў 1905 годзе накладам нейкага Яна Завадскага[1]*. Сумная гэта кніга, надрукаваная ў сумныя і найгоршыя часы, неўзабаве пасля адкрыцця ў Вільні помніка Мураўёву, і змяшчае шэраг, без сумневу, балючых фактаў. Іншая справа, ці мае яна вартасць гістарычнага дакумента, бо хутчэй з'яўляецца голасам гарачага сэрца, чым меркаваннем глыбокага і праніклівага назіральніка за рэчаіснасцю.*

Зараз, калі справа ксяндза Бальцэвіча зноў узнятая «Лідскай Зямлёй», вольна і нам падняць старыя віленскія газеты і нагадаць пра незвычайны выступ таленавітага ксяндза Фелікса Мяшкевіча, якога ніколі не абвінавачвалі ў адсутнасці патрыятызму. Гэты артикул «У справе ксяндза Бальцэвіча» быў надрукаваны ў тагачаснай расійскай штодзённай газеце «Віленскі Веснік» (№151, 13 (26).01.1904.)».

«Самы прыкры інцыдэнт, — пісаў ксёндз Ф. М., — *з ксяндзом Бальцэвічам выклікаў столькі розных меркаванняў і ўражанняў, да такой ступені ўзрушыў нават спакойны розум гарадской і вясковай інтэлігенцыі, што я зусім не здзівіўся, калі ўбачыў яе рэха ў мясцовай і сталічнай прэсе. Адусюль чуліся галасы кансерватыўных клерыкалаў, якія выклікалі маланкі на галаву злоснага ксяндза, поўніліся гневам таксама і лібералы з прагрэсістамі, бачачы ва ўсіх гэтых падзеях паўтор змрочных і жорсткіх сцэн сярэднявечнай тыраніі, прыгнёту індывідуальнасці, браку ўсялякай талерантнасці.*

[1] Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. Monachium, 1905. Naklad Jana Zawadzkiego.

Калі ўжо так шмат было сказана і яшчэ будзе сказана пра гэту справу, дык лічу, што не пашкодзіць пачуць і голас, які ідзе з асяроддзя, да якога належыць ксёндз Бальцэвіч.

Калі паўсюдна мы бачым (Ах! На жаль!) пену ад шалу ці сентыментальнае спачуванне, дык я перакананы, што... некалькі думак халоднага назіральніка павінны знайсці сваё месца ў газеце, якая, з любога пункту гледжання, паставіла перад сабой задачу служыць праўдзе. Нагадваючы прынцып ксяндза Бальцэвіча: Audiatur et altera pars (Няхай будзе пачуты і другі бок — *Л. Л.*), *смела выступаю не як пасрэднік, абаронца ці суддзя, але як пабочны назіральнік.*

Я не мог сачыць за ўсім ходам грамадскай думкі і вывучаць псіхалагічную фізіяномію скандалу, які выклікаў ксёндз Бальцэвіч і яго справа. Але відаць, што пры цяперашнім стане розумаў ён узняўся да вяршыні пакутніка за думку, за ідэю і праўду. Адны лічаць яго Праметэем лірычнай драмы Персі Шэлі, які ўсведамляе сваё становішча, з якога няма выйсця, калі не адрынуць мараль. Прыкаваны да скалы пачуццём уласнага бяссілля, ён кідаў словы горкай, але запазненай праўды ў твар рэлігіі і народа, да якога сам належаў. У ім загарэўся святы агонь праўды і сумленнасці, яго сэрца было ўразлівым і чулым да ўсяго святога і высокага. Іншыя ж кажуць, што ён паказаў, што галоўнымі падмуркамі чалавека ёсць любоў і міралюбства. А трэція, больш нячулыя людзі, ціха смяюцца, бо згадваюць камедыю Шэкспіра «Многа шуму з нічога».

А мне здаецца, што шум, які ўзняўся, і сам выступ ксяндза Бальцэвіча маюць больш глыбокі сэнс. Гэта не пратэст асобы супраць асобы, а пратэст грамадства су праць парадкаў і ўмоў, створаных пануючымі парадкамі і паняццямі. Ксёндз Бальцэвіч жорстка і нясвоечасова растлумачыў тое, што па розных прычынах назапасілася ў масе ліберапаў і незадаволеных асоб.

Мы не мае намеру цытаваць поўны тэкст артыкула ксяндза Ф.М., бо дастаткова і прыведзенага фрагмента»[1].

Аўтарам кнігі «Касцельныя стасункі ў Літве: адкрытыя лісты ксяндза да ксяндзоў» быў тагачасны пробашч Жырмунскага касцёла, а потым доктар Генрых Бальцэвіч (1866–1941), які нарадзіўся на Віленшчыне, скончыў духоўную семінарыю ў Сейнах і потым, пасля таго як ён напісаў скандальную кнігу і выдаў яе, не пазначыўшы свайго аўтарства, скончыў Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве і абараніў доктарскую дысертацыю. Ксёндз Генрык Бальцэвіч стаў філосафам і ў 1913 годзе выдаў кнігу (верагодна — сваю дысертацыю) пра філасофію Канта і Юма[2]. Дадам, што і ў 1903 годзе Бальцэвіч надрукаваў свае новыя артыкулы ў палемічнай брашуры. На гэты раз ён адстойваў права ксяндзоў наведваць канцэрты, і толькі пасля гэтага выдання ксяндзу забаранілі служыць[3].

У 1912 годзе Генрык Бальцэвіч прачытаў даклад пра вядомага дзеяча ВКЛ Пятра Скаргу, а Марыля Лясковіч надрукавала рэцэнзію на гэты выступ[4], у якой, сярод іншага, выказала сваю нязгоду са Скаргай, які сцвярджаў, што добрым палякам можа быць толькі католік, і крытычна аціла ўплыў Скаргі на тагачасную моладзь[5].

У 1930-я гады Бальцэвіч жыў у Ішчалне, пра што Шымялевіч, канечне ж, ведаў, але і праз 30 гадоў кнігу былога ксяндза выкідвалі з бібліятэкі.

Артыкул Чэслава Янкоўскага ў абарону ксяндза Бальцэвіча:

---

[1] Ze starych szpargałów // Pregląd Wileński. 1938. №4–5. S. 12.

[2] Bolcewicz, Henryk. Kant a Hume. Warszawa, 1913.

[3] Bolcewicz Henryk. W kwestii bywania księży na koncertach publicznych. Warszawa 1903.

[4] Laskowiczówna M. Odczyt o Ks. Skardze w warszawskiem związku nauczycielskim. Ruch Pedagogiczny. №8, S. 155–157.

[5] Ewa Barnaś-Baran. Dzieje oświaty i wychowania na łamach «Ruchu Pedagogicznego» w latach 1918–1939 // Miscellanea. S. 143.

«У Вільні, на Зарэччы, прыняты міласэрнымі і набожнымі людзьмі, жыве ксёндз Генрык Бальцэвіч, адхілены ад службы, пазбаўлены сваёй парафіі і права выконваць абавязкі каплана, а значыць, і сродкаў для існавання.

Што прывяло да такога жорсткага пакарання ксяндза Бальцэвіча з боку яго непасрэднай духоўнай улады — цяперашняга кіраўніцтва Віленскай дыяцэзіі? Ксяндзу Бальцэвічу было крыху больш за трыццаць гадоў, першай і адзінай парафіяй, даручанай яго пастырскай апецы, была жырмунская парафія ў Лідскім павеце. Ён правёў там дванаццаць гадоў, падаваў выдатны прыклад сваім парафіянам, аказваў дабратворны ўплыў на іх, узбагачаў іх душы, прапагандаваў маральныя прынцыпы і прыміраў сэрцы. Калі яго напаткала адхіленне ад службы, дэлегацыя ад 20 000 парафіян Жырнунаў накіравалася да адміністратара Віленскай дыяцэзіі ксяндза Францкевіча з шчырай просьбай пакінуць ксяндза Бальцэвіча на пасадзе, на якой ён служыў такі працяглы час. Адміністратар адмовіўся нават выслухаць дэлегацыю.

Цягам 1902 года ксёндз Гадлеўскі вёў гарачую і палкую палеміку ў варшаўскай «Кроніцы Радзіннай» з евангеліцкімі пастарамі, якія друкаваліся на старонках варшаўскага «Звястуна Евангелічнага». Ксёндз Бальцэвіч уважліва сачыў за развіццём палемікі і прыйшоў да высновы, што падыход ксяндза Гадлеўскага да гэтай справы заўзяты і зласлівы, што яго палеміка несумленная, а тон — «вульгарны». Ён напісаў артыкул «Пагромшчык пратэстантызму» і даслаў яго ў вышэйзгаданую «Кроніку Радзінную». У артыкуле рэкамендаваў святару паважаць праўду, мець хрысціянскую любоў да бліжняга і разумную руплівасць. Артыкул быў адхілены, але пасля розных перыпетый апублікаваны вясной таго ж года ў варшаўскім «Огніве».

Неўзабаве пасля гэтага ў тым жа «Огніве» з'явілася серыя кароткіх, але моцных артыкулаў ксяндза Бальцэвіча (як звычайна, з пазначэннем аўтара), прысвечаных адносінам духавенства да прэсы... ксёндз закрануў тэму вусных і дру-

каваных інсінуацый і адчуў абурэнне супраць сваёй асобы за гэтыя меркаванні. «У мяне ёсць непахісная перакананасць, — сярод іншага пісаў ксёндз, — што рыма-каталіцкі касцёл павінен стаяць на праўдзе і любові, і касцёл перастаў бы быць самім сабой, калі б яму спатрэбілася хлусня для сваёй абароны, ці ўтойванне і несумленнасць, ці калі б касцёл цярпеў бы гэта.

...Такім чынам, я выступаю не як абаронца пратэстантызму і не супраць абароны касцёла, а супраць усё яшчэ не стыгматызаванай этыкі, якая дыктуе талераваць ці нават хваліць непачцівасць выключна з-за таго, што яна здзейснена нібыта дзеля карысці касцёла.

Калі артыкулы жырмунскага пробашча пачалі набываць вядомасць, Віленская капітула выклікала аўтара да сябе, зрабіла яму заўвагу, запатрабавала адмовіцца ад сваіх артыкулаў і надрукаваць адмову ад іх у адным з часопісаў. Ксёндз Бальцэвіч, як чалавек глыбока перакананы ў правільнасці сваіх поглядаў і як святар, супраць якога не рабілася ніякіх спроб даказаць якія-небудзь парушэнні ім кананічнага права, не мог выканаць пажаданні капітулы.

Тады быў прапанаваны іншы тэкст «адмовы». Ксёндз Бальцэвіч, са свайго боку, прапанаваў яшчэ адну дэкларацыю, у якой урачыста запэўніў, што ён цалкам падтрымлівае касцёл і мае намер стаяць на яго баку да канца жыцця. Справа была разгледжана, і было абвешчана, што капітула не можа задаволіцца такой простай дэкларацыяй, а патрабуе адмовы і цэнзуры ўсяго, што ксёндз Бальцэвіч мае намер друкаваць у будучыні. Падчас гэтых перамоваў выйшлі артыкулы, раней дасланыя ў варшаўскую рэдакцыю.

Тады адміністратар Віленскай дыяцэзіі выклікаў ксяндза Бальцэвіча і адхіліў яго ад пасады. Бальцэвіч адразу ж здаў сваю парафію і перастаў выконваць сакраманты. Пазбаўлены ўсіх крыніц даходу, літаральна без сродкаў да існавання, ён знайшоў прытулак на віленскім бруку. З-за нязгаснай хрысціянскай любові сярод шчыра набожных душ і з-за

іх глыбокага пераканання ў тым, што суд Божы вышэйшы за суд чалавечы, ён атрымаў дах над галавой.

Ксяндзу Бальцэвічу нічога не заставалася, як толькі чакаць. Чакаць прыезду біскупа Попа ў Вільню, каб абскардзіць рашэнне вышэйшай улады. Чакаць — але чаго? Біскуп быў далёка, а голад блізка. Ксёндз Бальцэвіч мог бы звярнуцца да ўласнага незвычайнага пісьменніцкага таленту, бо піша ён з выключнай яснасцю і дакладнасцю, мае вытанчаны стыль, піша з глыбокім пераканнем у тое, у што горача верыць. Ён глыбока адчувае сваю грамадскую ролю, годнасць і абавязкі. Ён мае добрую адукацыю, мае грамадзянскую мужнасць, ясны, лагічны розум, чыстую і высакародную душу. Але ксёндз Бальцэвіч маўчыць. Ён толькі хоча перадаць справу ў рукі новага біскупа і абскардзіць папярэдняе рашэнне.

Што да самога грамадства, то ксёндз Бальцэвіч патрапіў на яго суд праз прэсу, і я лічу, што грамадства павінна мець сваё ўласнае меркаванне на гэты конт»[1].

Цікавую інфармацыю падае ў сваіх успамінах Гіпаліт Корвін-Мілеўскі:

«У той час вялікае абурэнне пабожнага грамадства выклікаў малады ксёндз Бальцэвіч, вікарый (здаецца, потым пробашч) невялікай парафіі на Лідчыне (Жырмунскай. — *Л. Л.*). *Гэты святар распачаў у варшаўскіх выданнях палеміку са сваімі віленскімі калегамі.*

Малады рэфарматар добра пісаў, але яго апаненты мелі значна большы ўплыў у віленскай капітуле. Да прадмета палемікі адразу дадалася прымешка самалюбства, і справа скончылася тым, што смелага літаратара ні больш ні менш як засуспендзілі (забаранілі служыць — Л. Л.) у сане, што для беднага вясковага пробашча азначала і грамадзян-

[1] Zwiastun Ewangeliczny. 1904. №1. S. 20—22.

скую кару ў выглядзе галоднай смерці. Амаль што ўсе сямейныя і сентыментальныя панны шкадавалі беднага ксяндза, але «маці касцёла» лічылі, што капітула не можа быць памылковай. Справа выйшла ў прэсу.

Адначасова таленавіты Чэслаў Янкоўскі ў пецярбургскім «Краі», а ў віленскім «Весніку» добры пісьменнік Цяплоў вельмі рашуча выступілі супраць рашэння капітулы, але гэта магло толькі пагоршыць лёс ксяндза. Абодва бакі — сентыментальныя верніцы і «маці касцёла» — звярнуліся да мяне, каб я выступіў ці за беднага ксяндза, ці за аўтарытэт духоўнай каталіцкай улады. Стаўшы над сітуацыяй, якую прасцей было ўскладніць, чым улагодзіць, я вырашыў для сябе, што праблему павінен вырашыць новапрызначаны біскуп, які хутка ўжо прыедзе. Адначасова было зразумела, што новы біскуп, чужы як для дыяцэзіі, гэтак і для грамадства, верагодна, будзе тэндэнцыйна інфармаваны пабожнымі махлярамі пяра, і трэба было знайсці нейкі прыём, каб адначасова звярнуцца і да біскупа, і да грамадства. Рэдактар «Віленскага Весніка» пан Чумікоў, з якім я паразмаўляў пра гэта, адразу ж з энтузіязмам пагадзіўся надрукаваць мой тэкст, але мне, каталіку і паляку, было б брыдка звяртацца да свайго біскупа па-руску. Спыніліся на тым, што я напішу біскупу Рону па-французску, і газета надрукуе мой ліст на гэтай жа мове. Мусіў пражыць дзясятак-другі правак, бо наборшчыкі ведалі лацінскія літары, але не ведалі французскай мовы, і, нарэшце, аніводнай памылкі ў газетным тэксце не засталося.

Мой план удаўся, і ксёндз-біскуп Рон хутка адказаў мне ў спакойным тоне і на добрай французскай мове. А што датычыць справы, дык ён паступіў як сумленны пастыр і сапраўдны хрысціянін. Адклаў на нейкі час, а потым і зусім скасаваў забарону ў сане і гэтак супакоіў занадта руплівага ксяндза. Потым за свае грошы выслаў яго ў Фрайбург нібы для вучобы, а пасля недзе даў яму парафію не горшую за ранейшую»[1].

Свой след у гісторыі Лідчыны пакінула дачка Юльяна Лясковіча (унучка Фелікса Лясковіча, які валодаў маёнткамі Кір'янаўцы і Бакуны) Марыя Лясковіч. Падаем ніжэй фрагмент з успамінаў яе пляменніка Караля Лясковіча:

«Рамантычныя пачуцці і глыбокая вера ў пазітыўныя ідэалы «арганічнай працы» сфармавалі індывідуальнасць маладой панны Марыі Лясковіч. У дзяцінстве яна разам з бацькамі вярнулася з глыбіні Расіі — з-пад Пярмі, куды яе бацька Юльян быў сасланы «на пасяленне» як палітычны злачынца. Разам з імі жыла ў маёнтку Пянткаўшчына, за 3 км ад мястэчка Жырмуны Лідскага павета. Маёнтак меў дрэнную, пясчаную зямлю з занядбанымі драўлянымі пабудовамі і таму не цікавіў рускую адміністрацыю. Гэта ўратавала гаспадарку ад канфіскацыі. Да таго ж Юльян быў больш асцярожны за свайго брата Альберта Войцеха, якога расстралялі ў 1863 годзе. Непасрэднага ўдзелу ў паўстанні Юльян не браў, аднак патрыятычнай дзейнасці не пазбягаў, што і прывяло да ссылкі.

Менавіта тут, у Пяткаўшчыне, Марыя спазнала вялікае каханне. Яна рамантычна закахалася ў кузэна, а той, не падазраючы пра глыбіню яе пачуццяў, расказаў пра свой будучы шлюб з паннай Тупальскай. Гэта стала паваротнай кропкай у жыцці Марыі Лясковіч. Яна прысягнула, што да канца жыцця застанецца вернай першаму каханню і не выйдзе замуж, а ўсё жыццё прысвеціць службе народу — менавіта гэтаму вучыў яе бацька. Адразу прыступіла да рэалізацыі сваёй клятвы — арганізавала ў Пяткаўшчыне тайную школу. Не мела патрэбнай кваліфікацыі, але выкладала ў першым класе як магла.

Хутка памёр яе любімы бацька. Гаспадарыць пачаў старэйшы, легкадумны брат Эдмунд. У духоўнай самоце

[1] Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiąt lat wspomnień (1855—1925). Poznań, 1930. S. 181; Корвін-Мілеўскі Гіпаліт. Успаміны пра семдзесят гадоў (1855–1925). Издательские решения, 2025. С. 168.

Марыя знайшла апору ў асобе вікарыя, а потым пробашча жырмунскага касцёла, маладога ксяндза Генрыка Бальцэвіча. Ён таксама натхняў яе працаваць для людзей. Досыць часта наведваў Пяткаўшчыну і ахвотна дапамагаў у справе нелегальнага навучання. Высокі, худы і прыстойны, меў розум даследчыка. Гарэў унутраным полымем, патрэбай чыну, быў рэвалюцыянерам у сутане. Яго артыкул, надрукаваны ў адным з часопісаў, пра ролю святарства ў свеце, узбудзіў гнеў касцельных уладаў. Артыкул быў надрукаваны без дазволу касцельнай іерархіі. Бальцэвіч не згадзіўся з выракам, зняў сутану і ў Лодзі пачаў жыццё звычайнага чалавека.

Вяртанне дахаты было немагчымым, і былы ксёндз пачаў працаваць хатнім настаўнікам. Пра рэвалюцыйнасць ксяндза і Марыі даведаўся спраўнік, і над дзяўчынай павісла пагроза паўторнай высылкі. Таму яны вырашылі разам перасяліцца ў Варшаву і пачаць вучыцца на настаўнікаў.

Але Марыя не дазволіла адносінам пайсці далей за сяброўскія. Кватэры знялі ў розных раёнах горада і не спатыкаліся ў сваіх прыватных кватэрах. Бальцэвіч стаў сапраўдным педагогам, настаўнікам гісторыі і літаратуры на ўзроўні гімназіі, г. зн. атрымаў вышэйшую адукацыю. Першапачатковая адукацыя Марыі была меншай, і яна атрымала толькі права настаўніцы пачатковай школы, аднак лічыла, што так будзе нават лепш для яе мэты жыць для людзей.

Абодва былі дзецьмі дзвюх эпох: рамантызму і пазітывізму. Іх «арганічная праца» заўсёды праходзіла «ў нябёсах», і іх жыццё было цалкам прысвечана гэтай працы, але цякло спакойна, манатонна і бедна. Заўсёды меўся нехта, хто патрабаваў дапамогі, і настаўніцкіх заробкаў ледзь хапала для сціплага жыцця.

Калі ў выніку сямейных падзелаў маёнтка Ішчална Марыя атрымала ў 1924 годзе ўчастак пад школу, мела яна ўжо 40 гадоў настаўніцкага стажу. І хоць у краі не хапала настаўнікаў, трэба было думаць пра пенсію. Толькі сэрца не згаджалася з гэтым.

Марыя, якую ў сям'і заўсёды звалі «цёця Марыня», у спадчыну ад Важынскіх атрымала права на адну чацвёртую частку маёмасці свайго пляменніка Юльяна. Таму пры падзеле яна выказала жаданне, каб адмыслова для яе пабудавалі школу для дзяўчат. Жадала атрымаць пляц у 4 га каля Ішчалнянскага тракту і пашкоджаны падчас вайны будынак даўняй коннай пошты. Патрабавала грошы на рамонт і на будаўнікоў, грошы на абсталяванне і дровы для ацяплення ўсіх школьных будынкаў.

Жаданне цёці Марыні было выканана. Калі яна пачала сваю цяжкую справу, мела больш за 60 гадоў на карку і ніякага гаспадарчага досведу. Аднак вера і запал могуць зрушыць горы. Згорбленая маленькая Марыня, няспрытная ў рухах і падобная на птушку, мела сівыя валасы, грубыя блізарукія акуляры на носе, на вуснах альбо ўсмешку, альбо каприз — самую моцную зброю ў барацьбе з мужчынамі. Бо як было не саступіць шляхетнай, безабароннай старой? Пры гэтым для сябе яна нічога не патрабавала. Марыя мела дзіўна маладыя рукі — мяккія, пяшчотныя, не для працы, але гэтыя слабыя рукі здолелі 15 гадоў цвёрда трымаць школьныя справы. Ідэалізм і сціпласць цёці Марыні разам з яе ўяўнай бездапаможнасцю складаліся ў зброю, якая крышыла ўсе перашкоды.

Яе школьная праца пачалася, расквітнела і дасягнула пэўных вынікаў пры канцы яе жыцця. Дарога не была лёгкай. Летам 1924 года сямейная рада Лясковічаў аддала ва ўласнасць цётцы Марыні дзялку з паўднёвага боку гістарычнага тракту. На гэтай дзялцы знаходзіўся мураваны будынак даўняй коннай пошты з дахам, крытым дахоўкай, але будынак быў ужо моцна пашкоджаны. Па яго абодвух баках стаялі таксама мураваныя гмахі старых стайняў без дахаў. Усё вымагала рамонту і нават адбудовы.

Пасля перабудовы школьны будынак меў 200 м² карыснай плошчы і дзяліўся на дзве паловы шырокім калідорам, у які выходзіла 6 дзвярэй — адны на вуліцу, другія на па-

дворак і чатыры ва ўнутраныя памяшканні. Улева ад галоўнага ўвахода месціліся два вялікія класы-працоўні: ткацкая і кравецкая. З правага боку ад фронту будынка была канцылярыя і жылы пакой кіраўніцы, а ў бок падворка — кухня і клас, у якім вучаніцы таксама і снедалі. У ткацкім класе стаялі двое вялікіх кроснаў, каб ткаць розныя тканіны. У кравецкім класе меліся два вялікія сталы.

Шчаслівая «цёця Марыня» радавалася, цешылася сваёй школай. Была яна тыповым рамантыкам часоў пасля паўстання 1863 года.

У суседнім доме Роўбы, у лепшым пакоі, жыў пенсіянер, сябар цёці Марыні, варшаўскі выкладчык і былы ксёндз Бальцэвіч. Колькасць педагогаў павялічылася да 8 асоб.

Бальцэвіч узяў на сябе выкладанне гісторыі і літаратуры.

Школа знаходзілася ў поўным росквіце, і разам з ёй самыя шчаслівыя гады свайго жыцця праходзілі ў двух ідэалістаў. Нічога, што абодва перасягнулі сёмы дзесятак, нічога, што Бальцэвіч не атрымліваў заробку, а ўсе грошы Марыні ішлі ў касу школы. Нічога, што абцасы абутку кіраўніцы школы былі ўшчэнт зношаны, а падэшвы дзіравыя, бо чарговая, прыгатаваная на пакупку абутку купюра ў 20 злотых заўсёды ішла на іншыя патрэбы.

Жыццё старых сяброў, як чыстае полымя, гарэла на ахвярным алтары для народа. Ажыццяўляліся галоўныя мары іх жыцця.

Марыя Лясковіч памерла вясной 1939 года. Яе труна, заваленая кветкамі, стаяла ў яе пакоі, праз адчыненае акно вечарам былі чутны трэлі салаўя.

Добра вядомая постаць Бальцэвіча скурчылася, згорбілася, і ён сунуўся за труной адзінокі, асірацелы. Зрок яго быў чужы і пусты. За труной ішоў увесь род Лясковічаў»[1].

Пасля смерці стваральніцы школы на некалькі месяцаў яе ўзначаліў доктар Генрык Бальцэвіч, які скончыў сваё жыццё ў 1941 годзе.

[1] Karol Laskowicz: (Kresowy dwór i jego sąsiedzi). Opracowanie na podstawie wspomnień. // Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu, sygn. 15480/II. S. 214–222.

МАЁНТАК ГАРОДНА

ПАЧАТКІ

Здаецца што, Асава — вёска блізкая да маёнтка Гародна — першы раз згадваецца ў 1522 г., калі кароль Жыгімонт канфірмаваў віленскаму ваяводзе Гаштоўту *«добра пустовскіе»* (пустыя) і грунты (зямлю) ў Лаўрына Петрашкевіча над ракой Асава[1].

Гародна заўсёды было адным з цэнтраў барцянскіх войтаўстваў на Лідчыне — Гарадзенскага войтаўства. Каля Гародна, праз 10 км на паўночны ўсход ад мястэчка Радунь, знаходзіліся барцянскія вёскі.

У 1567 г. з маёнтка Гародна (верагодна нейкай яго часткі) ставіў каня харунжы радуньскі Ян Контрым.

У тым жа 1567 г. Гародна — маёмасць Філіпа Шымкавіча (сына Шымкі Мацкавіча, фундатара Маламажэйкаўскай царквы) які валодаў таксама часткай Ваверкі і Забалаці: *«Панъ Филипъ Шимковичъ з ыменей своихъ… з Городное въ повете Лидскомъ, з Заболотья конь один, а з Ваверки конь одинъ, тыя дворцы лежатъ въ Лидском повеце…»*[2].

У 1622 г. унучка Шымкі Мацкавіча Багдана Сапега з Шымкавічаў, запісала сваю частку Мажэйкава дочкам: мсціслаўскай ваяводзіне Ганне Шамёт (жонцы Яраслава Шамёта) і Зоф'і Палубінскай (жонцы Канстанціна Палубінскага), пакінуўшы сабе да канца жыцця 1/3 частку маёнткаў Мажэйкава і Гародна ў Лідскім павеце. Таксама нейкую частку маёнткаў мела і трэцяя дачка Гальшка Сапяжанка, якая пайшла ў кляштар.

У 1623 г. Гальшка Сапяжанка адмовілася на карысць сясцёр ад сваёй часткі маёмасці Мажэйкава і Гародна (частку Гародна яна мела ад сваёй бабулі Настассі з

---

[1] AGAD AR. Zespol. 354 Dz. XI. K. 39.

[2] РИБ. Т. 33. С. 495.

Трызнаў, якая ў першым шлюбе была за Філіпам Шымкавічам, а ў другім за Завішам). У 1624 г. пасля смерці Багданы Сапегі з Шымкавічаў, яе дачка Ганна Шамёт дамовілася з Зоф'яй і Канстанцінам Палубінскімі аб роўным падзеле маёмасці, але паміж сёстрамі ўзніклі маёмасныя праблемы, якія ў 1627 г. вырашаліся ў лідскім гродскім судзе.

У 1692 г. Бердаўку Шункоўскіх і Гародна ўзяў у арэнду *«застаўным правам за суму 55 тысяч»* мсціслаўскі ваявода Ян Аляксандр Масевіч.

У 1728 г. часткамі маёнтка Гародна валодаюць стараста Пільвінскі Стэфан Храпавецкі разам з Ежы Брэсцкім — дваццаць дымоў. Ксёндз Ян Казімір Даўгель з Гародненскай плябаніі меў пяць дымоў, мсціслаўскі ваявода Масевіч меў тут чатыры дымы[1].

У першай палове XVIII ст. Гародна было спадчыннай уласнасцю княгіні Саламеі Радзівіл з Сапегаў. У 1762 г. яна падаравала маёнтак стрыечнаму ўнуку Людвіку Скумін-Тышкевічу (†1808), жанатаму з княжной Канстанцыяй Панятоўскай (1759–1830). Кароль Станіслаў Аўгуст у Літве вырашыў абаперціся на Тышкевічаў. Адну са сваіх пляменніц, дачку князя Казіміра Панятоўскага, кароннага падкаморыя, выдаў замуж за Людвіка Тышкевіча, для другой, Тарэзы, дачкі Андрэя Панятоўскага, аўстрыйскага фельдмаршала, выбраў Вінцэнта Тышкевіча, літоўскага ардынарыя. Людвік Тышкевіч, паслядоўна займаючы пасады віленскага цівуна, пісара вялікага літоўскага, гетмана польнага літоўскага, падскарбія вялікага літоўскага, а пасля падзелу краіны губернскага маршалка, «действи-

[1] Гл: Лаўрэш Леанід. Фундатар Маламажэйкаўскай царквы Шымка Мацкавіч і яго нашчадкі // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Янкі Купалы. Гродна: ГрДУ, 2021. С. 299–305; Лаўрэш Леанід. Ваверка і род Клаўсуцяў на Лідчыне // Лідскі Летапісец. 2021. №1 (93). С. 18–28.

Гетман Людвік Тышкевіч

тельного статского советника», паступова пашыраў свае ўладанні вакол Гародна, набыўшы Праважу і Забалаць з фальваркамі. Таксама каралём яму былі пажалаваны староства Эйшышскае, Васілішскае, Каняўскае, Радуньскае і інш. Цэнтрам сваёй рэзідэнцыі ён выбраў Гародна. Ягоная

зямельная маёмасць, падзеленая на дзве вялікія зоны, складалася з 65 вёсак. Добры гаспадар, ён трымаў свае маёнткі на высокім гаспадарчым узроўні.

З «Вопісаў парафій Лідскага дэканата» даведваемся, што ў 1784 г. Гародна — двор літоўскага польнага гетмана Тышкевіча, тут маецца парафіяльны касцёл з плябаніяй, карчма належыць да плябаніі. Нейкая частка Гародна належала Ёдкавай, маршалковай Лідскай. Вядома, што Тышкевіч фундаваў уніяцкую царкву ў Мыто: у 1792 г. візітатар апісваў гэтак: *«Драўляная, адрамантаваная, на падмурку, умацаваная рэйкамі і жалезнымі шрубамі, крытая гонтай. … Дуты пафарбаваны купал з драўляным крыжам, на купале звон… могілкі неагароджаныя»*.

Людвік Тышкевіч, жанаты з княжной Канстанцыяй Панятоўскай, дачкой князя Казіміра, подкаморага вялікага кароннага, роднага брата караля Станіслава Аўгуста, чакаў прыезду караля і, як кажа мясцовае паданне, на працягу аднаго года пабудаваў, хоць драўляны, але вельмі прыгожы двор у класічным стылі. Палац звонку не вылучаўся нічым асаблівым, але ўсярэдзіне быў бліскуча і з добрым густам аздоблены. На ўпрыгожванне сядзібы Тышкевіч выдаткаваў вялікія сумы, запрашаючы мастакоў-дэкаратараў і майстроў, а таксама выпісваючы матэрыялы наўпрост з Парыжа. Кароль Станіслаў Панятоўскі ў Гародна так і не прыехаў, аднак двор быў закончаны і, няглядзячы на гульню лёсу, дастаяў да канца Другой сусветнай вайны.

Пасля смерці Людвіка Скумін-Тышкевіча ў 1808 г. увесь гэты вялікі маёнтак атрымала ў спадчыну ягоная адзіная дачка Ганна (1779–1867). Яна была замужам за Аляксандрам Патоцкім, а потым за Станіславам Дуніным-Вансоўскім. Тастаментам ад 1867 г. перапісала Гародна сыну ад першага шлюбу Маўрыцыю Патоцкаму (1812–1879), пасля смерці якога ў 1880 г. усё перайшло ў спадчыну графу Аўгусту Патоцкаму. Уладальніца Гародна, графіня Ганна Патоцкая напісала найцікавейшыя мемуары пра часы На-

палеона і свае шматлікія сустрэчы з ім. Мемуары былі выдадзены ў XIX ст. на французскай мове і ў той жа час перакладзены на рускую, у 2005 г. перавыдадзены[1].

ГАННА ПАТОЦКАЯ З ТЫШКЕВІЧАЎ

Графіня Ганна Марыя Ева Апалонія Патоцкая, народжаная Скумін-Тышкевіч (26.03.1779, Варшава — 16.08.1867, Парыж) увайшла ў гісторыю як пісьменніца і мастачка. Скуміны-Тышкевічы старажытны беларускі род з XVI ст. сцісла злучаны з Лідчынай.

Ганна Тышкевіч гэтак пісала пра свайго бацьку, працытую вялікі кавалак цікавага тэксту, які наўрад ці можна лічыць аб'ектыўнай гістарычнай крыніцай: *«Падчас апошняга падзелу ён далучыўся да невялікай колькасці асоб, якія адмовіліся падпісаць несправядлівы і зневажальны акт Таргавіцкай канфедэрацыі, прадыктаваны Расіяй. З-за гэтага адважнага ўчынку ўся яго маёмасць была секвестравана, але ён з цвёрдасцю, моўчкі падпарадкаваўся гэтаму суровому прысуду — выніку яго непахіснай волі і патрыятызму.*

Праз некалькі гадоў, каб выклапаціць захаванне старажытнага Літоўскага статута, Вялікае Княства Літоўскае паслала дэлегацыю ў Пецярбург да імператрыцы (у 1795 г. — Л. Л.). Дэпутацыя, якая складалася з самых знакамітых вяльможаў, была прынята Кацярынай з чароўнай ветлівасцю, пры дапамозе якой яна так па-майстэрску падкупляла сэрца... дэпутаты былі ёй запрошаны ўдзельні-

[1] Гл.: Графиня Анна Патоцкая. Мемуары. 1794–1820. Москва, 2005.

Канстанцыя Тышкевіч з Панятоўскіх

чаць у пяці бліскучых прыёмах і лічылі сваім абавязкам не прапусціць ні аднаго з іх. І толькі мой бацька з'яўляўся да двара выключна, калі гэтага патрабавалі ўскладзеныя на яго абавязкі.

Імператрыца, здзіўленая і пакрыўджаная падобнымі паводзінамі бацькі, не магла ўтрымацца, каб не выказаць яму свайго незадавальнення, і рэзка заўважыла, што ён адзін не праяўляе цікаўнасці і не імкнецца ўбачыць усе цуды прыдворных святкаванняў. Не збянтэжыўшыся і як бы прымаючы кінуты яму папрок за выраз адмысловай Божай ласкі, бацька з глыбокім паклонам адказаў, што становішча, у якім знаходзіцца яго краіна, не дазваляе яму хаваць свае журботныя пачуцці і што, на яго думку, не варта азмрочваць бліскучыя святы выглядам няўцешнага смутку. Хітрая Кацярына, адразу зразумела, што ўяўляе з сябе гэты чалавек, які адважыўся адказаць ёй падобным чынам і ўсклікнула, што нічым на свеце яна так не захапляецца, як незалежнымі і ўзвышанымі пачуццямі, і дадала:

— Як жанчына, я спачуваю тым няшчасцям, прадухіліць якія мне, як царыцы, перашкаджае суровая палітыка.

І перш чым выйсці, яна адкалола ад пояса малы гадзіннік, аздоблены смарагдамі і падала майму бацьку, просячы яго прыняць гэты падарунак як доказ сваёй незвычайнай павагі і захаплення высакароднымі паводзінамі графа. Пасля гэтага быў зняты секвестр з маёнткаў майго бацькі».

Сваю маці маладая графіня ўзгадвала разам з апошнім каралём Рэчы Паспалітай: *«... я таксама каралеўскага роду... мая маці была пляменніцай нашага апошняга караля — Станіслава-Аўгуста Панятоўскага. Высакародная фігура гэтага манарха, веліч яго манер, ласкавы і меланхалічны погляд, серабрыстыя валасы і прыгожыя, лёгка прыпухлыя рукі — усё гэта жыве ў маёй памяці....*

Мая маці пайшла за каралём у Гародню, куды ён прымушаны быў адправіцца па патрабаванні рускай партыі. І там з акна маленькага пакойчыка, куды мяне пасялілі разам з гувернанткай, я кожную раніцу магла назіраць выезд палоннага караля. Рускія салдаты так напалохалі маё дзіцячае ўяўленне, што патрэбен быў увесь аўтарытэт маці,

каб прымусіць мяне пераступіць парог пакоя, — хоць і не без супраціву і слёз з майго боку....

Пры іншых абставінах Панятоўскі з годнасцю займаў бы пасад. Яго валадараннe склала эпоху ў навуковых летапісах. Ён уваскрэсіў густ да мастацтва і літаратуры, задушаных уладай саксонскіх курфюрстаў, грубасць якіх спарадзіла па ўсёй краіне пагібельную рэакцыю.

Станіслаў Панятоўскі, наадварот, знаходзіў задавальненне ў высакародных і карысных занятках і амаль увесь свой вольны час праводзіў у коле навукоўцаў і мастакоў. Шырокая і рознабаковая адукацыя злучалася ў ім з вытанчаным густам і розумам, поўным зачаравання. ... Ён меў высакароднае і ўзвышанае сэрца, часта не ведаючы межаў сваім дабрадзействам, велікадушна дараваў сваім ворагам; але прырода, якая гэтак шчодра адарыла яго як чалавека прыватнага, адмовіла яму як уладару, у тым, без чаго нельга валадарыць: у сіле характару і цвёрдай волі.

Пасля таго, як кароль з'ехаў у Пецярбург, мы вярнуліся ў Беласток, дзе жыла мая цётка, кракаўская кашталянка — удава кракаўскага кашталяна графа Браніцкага і сястра караля Станіслава-Аўгуста Панятоўскага...».

Прафесар Зыгмунт Батоўскі пісаў, што гетман Тышкевіч памёр у 1808 г. і пахаваны ў Вільні ў сямейным склепе без надмагілля, а яго жонка Канстанцыя з Панятоўскіх пахавана на могілках у Сянявах.

Адукаваная, начытаная дзяўчынка, адзіная дачка ў сям'і і спадчынніца дзвюх вялікіх маёмасцяў, была засватана ў чатырнаццаць гадоў за роднага дзядзьку, які меў ужо каля шасцідзесяці гадоў. На шчасце, вяселле не адбылося.

Хатняя адукацыя маладой графіні была настолькі выдатнай, што Анетка (так звалі яе ў маладосці) лічылася інтэлектуалкай варшаўскіх салонаў. Панна Тышкевічанка нават у бліскучым атачэнні вызначалася надзвычайным розумам — хуткім і зласлівым, мела добры густ і цвярозыя меркаванні аб рэчах і людзях. Але графіня да канца

Анетка Тышкевіч

жыцця дасканала не ведала ні польскай, ні французскай моваў, і яе правапіс пакідаў жадаць лепшага.

Значна лепш яна была адукавана ў галіне выяўленчага мастацтва, у якім маладая графіня Тышкевіч мела пэўны талент. Моднаму ў той час маляванню падчас яе знаход-

жання ў Дрэздане і Вене ў 1795 г. Анетку вучыў французскі жывапісец і гравёр Ігнацы Дзюўе (1758–1832). З 1797 г. Ганна брала ўрокі ў Зыгмунта Фогеля (1764–1826) — мастака і кабінетнага рысавальніка караля Станіслава Аўгуста і, верагодна, таксама брала ўрокі ў Яна Пятра Норбліна.

Ігнацы Дзюўе атрымаў адукацыю ў знакамітага італьянскага мастака Джавані Батыста Казановы і спецыялізаваўся на пейзажным жывапісе. У 1794 г. ён прыехаў у Вену праз Дрэздан, дзе жыў і працаваў трыццаць гадоў, каб напрыканцы жыцця вярнуцца ў Францыю. У 1801 г. ён быў прыняты ў члены Венскай акадэміі.

Горш было з жаночай прыгажосцю, якая, здаецца, не адпавядала вялікай жаноцкай прывабнасці Анеткі. Мастачка, калекцыянерка, аўтарка прац па археалогіі Наталля Ганна Кіцкая з Біспінгаў (1801–1888), якой маладая графіня не падабалася, паведамляла ў сваіх мемуарах: *«Вельмі сутулая* (па-польску — *„garbata“ — Л. Л.*), *у меру сімпатычная з рэзкай кемлівасцю і нястрыманым фліртам, да трыццаці гадоў яна не магла знайсці дастаткова смелага мужчыну, які б ажаніўся з ёй»*.

«Пад уплывам вялікіх паэтаў мой розум і сэрца былі перапоўненыя нейкім дзіцячым захапленнем. Я марыла пра герояў Расіна ці рыцараў ..., аб глыбокай жарсці, аб раптоўнай сімпатыі, аб вялікіх і высакародных подзвігах... І я чакала! Але калі ўбачыла, што час праходзіць і не з'яўляюцца ні Брытанік, ні Ганзаллё Кардуанскі, і нават наўрад ці з'явіцца Грандысан, вырашыла сысці з аблокаў на зямлю, з сумам думаючы, што, хутчэй за ўсё, прыйдзецца, як і ўсім, дзеля прыстойнасці, па разліку выйсці замуж», — пісала Ганна пра сваю маладосць.

Нават калі меркаванне Наталлі Кіцкай было не вельмі аб'ектыўным, яно сведчыць, што Анетка не была прыгажуняй і, магчыма, не карысталася вялікай сімпатыяй свайго кола. Пісьменнік і паўстанец 1831 г. Юліюш Фалькоўскі

таксама пісаў у сваіх «Карцінах з жыцця апошніх пакаленняў у Польшчы» (Juliusz Falkowski. Obrazy z życia kilku ostatnich pokoleń w Polsce): *«Яна была маленькая, хворая, ці, кажучы прама, крыху гарбаватая, мела мужчынскія рысы твару, вочы, зацененыя густымі брывамі і нізкі лоб»*.

У канцы XVIII ст., у дзявочыя часы Анеткі Тышкевічоўны быў створаны партрэт, які, мабыць, дзякуючы таленту мастака, не пацвярджае крытыку наконт знешнасці нашай арыстакраткі. З партрэта Анетка глядзіць на гледача, павярнуўшыся да яго, бо ён як быццам перапыніў яе працу. Дзяўчына ва ўсёй красе маладосці, са спакойным тварам, абрамленым цёмнымі кудзеркамі. Казімір Стрыенскі апублікаваў у 1897 г. гэтую геліягравюру Паўла Дзюжардэна і сцвярджаў, што гэта копія карціны Анжаліка Каўфмана, якая захоўвалася ў Заторы, але насамрэч партрэт быў напісаны ў 1794 г. Юзафам Грасі. Вельмі хутка, у 1796 г., іншы мастак — Вінцэнты Лесэр — зрабіў мініяцюру з гэтага партрэта. У руках Анеткі эцюднік і рэйсфедар, што кажа пра яе цікаўнасць да мастацтва і праектавання.

27 траўня 1805 г. у віленскім касцёле св. Яна адбыўся шлюб Ганны Тышкевіч з графам Аляксандрам Станіславам Патоцкім. Разлік збольшага апраўдаўся: Аляксандр Патоцкі лічыўся адной з лепшых партый у Польшчы. Ён быў сынам графа Станіслава Косткі Патоцкага, і адносіны Ганны са свёкрам склаліся надзвычай добра, маладая нявестка была ў захапленні і мела моцную прыхільнасць да бацькі свайго мужа, але стасункі са свякрухай не склаліся, і адносіны з мужам таксама пачалі разбурацца.

Трэба заўважыць, што маладая сям'я жыла ў прыгожым Вілянаўскім палацы Варшавы, які быў пабудаваны ў 1677–1698 гг. для караля Яна Сабескага і з'яўляецца шэдэўрам барока. У 1805 г. Станіслаў Костка Патоцкі адкрыў у палацы адзін з першых у Польшчы музеяў. Таксама Патоцкія перабудавалі прыдворны касцёл св. Ганны і збудавалі побач з палацам фамільную пахавальню.

Адразу пасля свайго замуства Ганна Патоцкая многа малявала і нават атрымала вядомасць сваімі праектамі паркаў, у тым ліку ў Натоліне, у Заторы і Мокатаве (у гэтых парках зараз гуляе мой унук).

З першага шлюбу Анетка Патоцкая, у дзявоцтве Тышкевіч, захапляецца праектаваннем. Пад яе алоўкам ствараліся абрысы розных будынкаў, прызначаных для маёнткаў, якімі валодалі сужэнцы. Яна любіла афармляць вясковыя дамы, капліцы, прыдумляла розныя дэталі: вароты, агароджы, масткі, убранне інтэр'еру і мэблю. Гэтыя інтарэсы, падмацаваныя папярэдняй адукацыяй у галіне мастацтва, развіліся пад уплывам Станіслава Косткі Патоцкага, мастацтвазнаўцы, які і сам займаўся праектаваннем. Анетка пакінула пасля сябе шмат малюнкаў і эскізаў. Тыя, што захаваліся ў зборах Патоцкіх у Вілянове, былі каталагізаваны і апублікаваны. Яна ўспамінала: *«Прыемна мне расказваць пра свайго цесця, якога я вельмі любіла і цаніла. Яму я абавязана ўсім, што ведаю пра архітэктуру, ён развіў ува мне любоў да мастацтва, якая потым падсаладзіла маё жыццё, і якую мая маці хацела абудзіць ува мне як каштоўную крыніцу для жывой фантазіі»*.

Анетка Патоцкая-Вансовіч, народжаная Тышкевіч, спрыяла развіццю палацава-садовых рэзідэнцый у Вілянове, Натоліне, Макотаве, Яблоне і Заторы. Яна так апісала свой удзел у гэтым: *«Менавіта ў гэты час мы пераехалі ў Натолін, і я пачала даглядаць гэты цудоўны маёнтак. Маючы запал да гэтага віду дзейнасці, я з энтузіязмам аддалася яму. Я малявала ўсе планы і цікавілася кожнай дэталлю. [...]. Мой цесць быў маім правадніком і, здавалася, ганарыўся тым, што зрабіў з мяне мастака. [...]. Шчаслівыя часы, калі адзінай прычынай бессані была празмернасць ідэй, якія віруюць ва ўяўленні! [...]. З якім нецярпеннем я чакала раніцы, каб выкласці на паперы ідэі, народжаныя ў начной цішыні»*.

У Мокатаве яна перабудавала рэзідэнцыі ў неагатычным стылі, які ўсё больш уваходзіў у моду. Анетка была адукаваным інвестарам, таму для маштабных работ наймала найлепшых архітэктараў. Імкнулася прапагандаваць культ князя Юзафа Панятоўскага і стварыла прысвечаны яму музей у спадчынным палацы ў Яблоне. Таксама была ініцыятарам і сузаснавальнікам помніка ў яго памяць і вяла перамовы аб гэтым з Бартэлем Торвальдсенам[1].

Сучаснікі высока ацанілі пачынанні Ганны Патоцкай. Юліюш Фалькоўскі, пісаў: *«Яна была выдатным знаўцам усіх галін мастацтва, была добрым мастаком і яшчэ лепшым архітэктарам і садоўнікам, і калі яна стала гаспадыняй вялізнага маёнтка, уласнаручна складала планы будаўніцтва і перабудовы сваіх дамоў. У яе быў выдатны густ ва ўсім, яе меркаванне аб рэчах ніколі не было запазычаным, але развітым у ёй і заўсёды праніклівым і дакладным».*

Падарожнічаючы па Еўропе, маладая замужняя жанчына Ганна Патоцкая наведвала майстэрні вядомых мастакоў, знаёмілася з экспазіцыямі музеяў і прыватных калекцый. У 1810–1811 гг. у Парыжы яна вывучала жывапіс мастакоў Жака-Луі Давіда, Анэ-Луі Жырадэ дэ Трыёсан і Франсуа Жэрара, а таксама пазнаёмілася з генеральным дырэктарам Збораў мастацкіх калекцый Дамінікам Віванам Дэнонам. Разам з генеральным дырэктарам яна вывучала яго прыватныя калекцыі і наведвала Луўр. Свае ўражанні Ганна ўвекавечыла ва «Успамінах відавочцы»[2], напісаных праз шмат гадоў. Між іншым, у гэтай кнізе чытаем пра за-

[1] Бартэль Торвальдсен (1770–1844) — дацкі мастак, скульптар, яскравы прадстаўнік позняга акадэмічнага класіцызму.

[2] Wspomnienia naocznego świadka (cz. 1–3), oprac. B. Grochulska; przekł. J. R. przejrzała i uzupełniła na podst. rękopisu: sygn. 308a Z. Lewinówna. Warszawa. 1965.

Графіня Ганна Потоцкая, 1791. Мастак Элізабэт Віжэ-Лебрэн

чараванне падчас агляду ў калекцыі Дэнона ад *«маленечкай лапкі* [егіпецкай] *мумії, такой цудоўнай, такой мілай, так прыгожа пацямнеўшай за стагоддзі, што захацелася скрасці яе і зрабіць прэс-пап'е для кабінета»*.

Ганна Патоцкая таксама паспрабавала свае сілы ў гравюры, тут яна выкарыстоўвала любімую аматарамі тэхніку

афорту. У гэтай тэхніцы па сваіх уласных малюнках яна зрабіла некалькі гравюр: «Выгляд фантана ў Лазенках» і «Від на плошчу Жыгімонта ў Варшаве» (абедзве падпісаны і датаваны: *«Вена, 1795»*), а таксама гравюру руінаў царквы ў Гародні. Маладая жанчына малявала віды гарадоў, складала архітэктурныя праекты, малявала пейзажы і кніжныя ілюстрацыі. Калекцыя сям'і Патоцкіх у Вілянава, сярод іншага, змяшчала яе атмасферная ілюстрацыі да чацвёртага раздзела рамана Эн Рэдкліф «Удольфскія таямніцы» (The Mysteries of Udolpho). Гэтыя ілюстрацыі зараз знаходзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы.

У часы Варшаўскага княства пад французскім пратэктаратам Ганна мела сувязь з прыгожым (па агульным меркаванні) Артурам Патоцкім. Пазней нейкія адносіны звязвалі яе з Каралем Флахаўтам, з якім яна пазнаёмілася ў Варшаве ў 1807 г.

Асаблівага кахання паміж мужам і жонкай не было, Патоцкія пражылі разам больш за дзесяць гадоў, нарадзілі траіх дзяцей: двух сыноў і дачку (Аўгуста, Маўрыцыя і Наталлю (1810–1830), якая ў 1829 г. выйшла замуж за князя Сангушку). У 1821 г. сужэнцы мірна развяліся, і абодва ўступілі ў новыя шлюбы.

Граф Аўгуст Аляксандр Патоцкі (1806–1867). У 1830–1831 гг. Аўгуст Патоцкі разам з малодшым братам Маўрыцыям браў удзел у Лістападаўскім паўстанні. Пасля паражэння паўстання браты эмігравалі ў Галіцыю. Аўгуст Патоцкі заставаўся ў эміграцыі да канца 1830-х гг., і па волі свайго бацькі, яшчэ да вяртання ў Варшаву, стаў уладальнікам багатых маёнткаў Вілянаў, Хойнаў і Застаў.

Падчас знаходжання пры пецярбургскім двары, пасля жаніцьбы 11 студзеня 1840 г. з фрэйлінай імператрыцы — Аляксандрай Патоцкай, Аўгуст вярнуў добрае стаўленне да сябе імператара. Ён быў выключаны са спісу асоб, чыя маёмасць падлягала канфіскацыі. Аляксандра Патоцкая

(1818–1892) была адзінай дачкой генерал-ад'ютанта і ўдзельніка напалеонаўскіх войнаў Станіслава Патоцкага (1787–1831) і князёўны Кацярыны Сангушкі (1781–1820).

У сярэдзіне 1840-х г. Аўгуст Патоцкі разам з жонкай вярнуўся ў Варшаву. Пасля смерці свайго бацькі (1845 г.) ён стаў паўнапраўным уладальнікам вілянаўскіх і іншых шматлікіх маёнткаў, валодаў таксама яшчэ і вялікімі маёнткамі сваёй жонкі. У 1852 г. быў узнагароджаны прыдворным званнем шталмайстра. У 1856 г. атрымаў чын сапраўднага стацкага дарадцы.

Сваёй рэзідэнцыяй абраў Вілянаў, дзе разгарнуў будаўнічую дзейнасць у супрацоўніцтве з архітэктарам Генрыкам Марконі, які, яшчэ па замове яго бацькі, пабудаваў у Вілянаўскім палацы маўзалей для Станіслава Косткі і Аляксандры Патоцкіх.

Аўгуст Патоцкі не пакінуў пасля сябе дзяцей і тастамента, яго маёнткі былі падзелены паміж іншымі спадчыннікамі. Жонка Аляксандра атрымала ў спадчыну вілянаўскія маёнткі, якімі валодала ажно да сваёй смерці ў 1892 г.

Габрыэля Пузыня з Гюнтараў пісала: *«Граф Аўгуст Патоцкі, пан на Вілянаве, у той час яшчэ не жанаты, таксама неаднаразова з'яўляўся ў Вільні па дарозе ў Беразіну, свой маёнтак у Мінскім павеце»*.

Граф Маўрыцый Яўстах Людвік Патоцкі (1812–1879), уладальнік маёнткаў Яблона і Затор. У маладосці — афіцэр арміі Царства Польскага, камергер. У 1830–1831 гг. удзельнічаў у Лістападаўскім паўстанні. Пасля задушэння паўстання вымушаны эміграваць у аўстрыйскую Галіцыю.

У гонар Маўрыцыя яго дзед і бабуля Станіслаў Костка Патоцкі і Аляксандра Патоцкая ператварылі частку Вілянава на ўсходнім беразе Вілянаўскага возера (былы звярынец караля Яна Сабескага) у рамантычны парк і назвалі яго Маўрыцынам.

Маўрыцый Патоцкі ажаніўся ў Дрэздане 6 лютага 1847 г. з Людвікай Жазэфінай Бобр-Пятравіцкай (1825–1890), дачкой Тэадора Міхала Юзафа Бобр-Пятравіцкага (1800–1865) і Яны Маржкоўскай (1807–1897). Па словах князя Шчарбатава, граф Патоцкі *«быў добрым, але пустым малым, жонка яго была разумнейшая за яго, але не была важнай птушкай у вышэйшым варшаўскім грамадстве»*.

Сужэнцы мелі дзяцей:

— Аўгуста Адама Патоцкага (1847–1905), з 1891 г. жанатага з Яўгеняйі Войніч-Сенажэцкай (1870–1925), менавіта яму потым належала Гародна.

— Наталлю Сафію Марыю Патоцкую (1849–1916).

— Марыю Ганну Наталлю Патоцкую (1851–1945), 1-ы муж з 1869 г. граф Тамаш Францішак Замойскі (1832–1889), 2-і муж з 1893 г. князь Канстанцін Яўген Андрэй Адам Любамірскі.

— Яўстах Маўрыцый Аляксандр Патоцкі (1859–1914), жанаты з 1879 г. з Ганнай Анеляй Паляжак (1863–1917).

У 1826–1827 гг., пасля разводу з Аляксандрам Патоцкім, Ганна Патоцкая падарожнічала па Італіі і напісала пра гэта кнігу. Толькі ў 1899 г. рукапіс кнігі «Падарожжа па Італіі» быў апублікаваны ў Парыжы Казімірам Стрыенскім.

Другім мужам Ганны стаў палкоўнік граф Станіслаў Дунін-Вансовіч (1785–1864), які ў 1812 г. быў лейтэнантам імператарскай гвардыі і перакладчыкам пры паходнай канцылярыі Напалеона. Як ад'ютант Напалеона, палкоўнік Дунін-Вансовіч быў з ім падчас ссылкі на востраў Эльба. Гэты шлюб, несумненна, азначаў пэўнае паніжэнне сацыяльнага і сяброўскага становішча, і таму жонка палкоўніка, нягледзячы на тое, што да другога шлюбу мела свой салон у сталіцы, пакінула свецкае жыццё. Мемуарысты пісалі пра яе ўсё меней, але былі і выключэнні, якія варта працытаваць: *«... яна выйшла замуж за Вансовіча, чалавека з праўдзівым і шчырым характарам. Ён трымаў яе цвёрда, не даз-*

валяў ёй заляцацца і какетнічаць, нагадваў пра яе ўзрост, і таму ніхто ўжо больш не пакутаваў ад яе рэзкай дасціпнасці», — пісала ўсё тая ж Наталля Кіцкая.

Габрыэля Пузыня з Гюнтараў так апісвала візіт сваёй маці з дочкамі ў 1831 г. да сяброўкі дзяцінства Анеткі, працытую тут вялікі і цікавы кавалак ўспамінаў: *«Вілянаў стаяў пусты, калі толькі можна так назваць месца, напоўненае помнікамі культуры. Ніхто з маладых Патоцкіх яшчэ не ажаніўся, і іх маці, пані Вансовічава, у сваім Мокатаве, як у якім Трыаноне, з радасцю, але крыху паблажліва і крыху кісла, прымала гасцей. Яна даведалася, што мая маці ў Варшаве, і праз некага паведаміла аб сваім жаданні аднавіць знаёмства дзявочых гадоў. І таму, калі аднойчы ў нядзелю мы выбраліся на ілюмінацыі ў Лазенкі, дык наведалі і Мокатаў. Там ужо было некалькі варшавякаў якія бавіліся перад домам. Нас прывіталі з прыстойнай ветлівасцю і, агледзеўшы, запрасілі сесці і пачаставалі суніцамі і гарбатай. Сярод гасцей была і пані Заёнчкава*[1], *вядомая сваёй вечнай маладосцю, убраная ў лёгкую муслінавую сукенку і маленькі крэпавы капялюшык, мела яна ўжо восемдзесят гадоў. Калі ішла вуліцай, на яе заглядалася моладзь, якая не падазравала што асоба, якая так лёгка ступае з каменя на камень сваёй маленькай ножкай, можа быць такой немаладой. На балях яе часта запрашалі на танец, а падчас халеры, калі Заёнчкава выказала свой непакой: «Qu'a-t-elle a craindre l'epidemie», хтосьці злосна ўсклікнуў: «n'a-t-elle pas passe deux quarantaines!?»* (фр. *«Нашто вам баяцца эпідэміі?», «Хіба ж вы не сядзелі ўжо два разы на каранціне!?». — Л. Л.*). *Таксама казалі, што яна некаторы час насіла штучны бюст з воску і загадала заказаць пяцьдзесят бюстаў сабе на карнавалы, яе ж сакратар зласліва дадаў нуль. Калі заказ прый-*

[1] Аляксандра Заёнчак з Пярнетаў, жонка намесніка.

шоў з Парыжа, бядачка не ведала, што рабіць з пяццюстамі бюстамі. Тыя, хто ведаў яе жыццё, казалі, што сваёй свежасцю і здароўем яна абавязана скрыні з лёдам, над якой спала ў халодным пакоі.

Развітваючыся з намі, пані Вансовічава запрасіла на абед. Унучка апошняга караля, памятала яшчэ яго чацвярговыя абеды[1] *і запланавала прыём на чацвер. Нягледзячы на слоту, мы прыехалі ў прызначаны дзень і час. Дождж скончыўся, але на жвіровай дарозе яшчэ стаяла вада. Вазніца праехаў праз браму на сярэдзіну парка і спыніўся каля шкляных дзвярэй ніжніх апартаментаў. «Le maladroit!» — выкрыкнула пані Вансовічава: «if aurail pu briser les vitres» — «Vous voyez bien, qu'i1 ne l'a pas fait?»* (фр. *«Няўмелы», «Ён мог разбіць акно», «Але ён не зрабіў гэтага». — Л. Л.*) *— спакойна адказала мая мама на такое своеасаблівае прывітанне, а пані графіня, запрасіўшы нас сесці ў крэслы з гербамі, наракала, што мы застаёмся без мужчынскай кампаніі: «Трэба ж, каб абодва мае сыны сёння раніцай адправіліся ў свае далёкія маёнткі». Сказаўшы гэта, яна зласліва ўсміхнулася і потым уважліва агледзела нас, бо мела надзею ўбачыць румянец ці туалеты, якія б казалі пра нашы планы. Але, насуперак яе думкам, абедзве мы былі ў белых паркалёвых сукенках.*

Мы спусціліся ў сутарэнні, і, паколькі з абедам марудзілі, пані Вансовічава прапанавала заспяваць «pour I» etpecher er avoir laim» (фр. «Каб ён не адчуваў голаду». — Л. Л.). Пасля слоў камердынера: «M-me la Comtesse est servie» (фр. *«Мадмуазэль графіня, мы гатовы падаваць». — Л. Л.*), *яна прайшла да стала разам з маёй маці і папрасіла прабачэння за халаднік, бо тут не тая вада. Праз хвіліну, ужо забыўшыся*

[1] На «чацвярговых абедах» караля з найбліжэйшымі паплечнікамі — сапраўднай інтэлектуальнай элітай таго часу, падданым падаваўся прыклад ашчаднасці і цвярозасці. — *Л. Л.*

што казала раней, пахваліла паштэцікі з беконам і паслала камердынера да кухара даведацца: «Што гэта такое дасканалае?». А на адказ: «Гэта кракеты з беконам», выпаліла: «Выдатна! Скажыце яму, каб гатаваў гэта часцей». На абедзе нас было сем чалавек, прыслужвалі камердынер-француз і два лакеі-палякі, з якімі графіня ўвесь час ажыўлена размаўляла, тлумачыла з польскай на французскую і наадварот усё што прамаўлялася на гэтых абедзвюх мовах. Налівала аднаму з іх келіх віна, а другога адпраўляла да старой боны з пытаннем, ці не трэба чакаць буры, бо трошкі грымеў гром. Тысячы падобных дзеянняў ішлі адно за другім, гэтым, пэўна, яна хацела давесці добрае стаўленне гранд-дамы да асоб з вёскі.

Пасля абеду з Варшавы прыехаў нейкі неспадзяваны пан. «Небу абавязаны мы гэтым цудам», — жартаўліва заўважыла мая маці, цытуючы верш з «Заіры», а гаспадыня дома папрасіла госця сесці і, калі той упарта маўчаў, выправадзіла яго ў суседні пакой, адкуль да нас даходзіў на пачатку ціхі, а потым усё гучнейшы дуэт узаемных пагроз. Справа ішла пра арэндную плату, забяспечаную загадзя на некалькі гадоў за палац Патоцкіх і сёння адабраную. Арандатар, упэўнены ў сваёй праваце, пагражаў судом, пані Вансовічова не дала яму скончыць і вярнулася да нас, не развітаўшыся з арандатарам, які сыходзіў угневаны. «Moi qui l'ai fait assoirl» (фр. *«Я зрабіла гэта». — Л. Л.*) *— абурана пракрычала яна, і кроў Панятоўскіх агнём загарэлася ў яе вачах.*

Немагчыма апісаць наш візіт, усё было такога кісла-салодкага кшталту, аж да заўвагі, што мы няспешна, як на шпацырах уваходзім у яе салон, аж да абдымкаў з падзякай, калі мы запэўнілі яе, што не працерлі сукно яе мэблі, аж да дазволу маёй сястры скапіраваць пейзаж Мокатава, калі Вансовічава даведалася, што яна малюе. І дадала: «C'est une grande grace, que je vous fais» (фр. *«Раблю для цябе гэту вялікую паслугу». — Л. Л.*).

Кабінет у Гародна, 1842 г., малюнак Ганны Патоцкай

Досыць. Вяртаючыся дадому, мы адчувалі, як вырваліся з ціскоў, і візіт графіні ў адказ у наш гатэль праз некалькі дзён выглядаў, як знак ласкі ўнучкі апошняга караля да старой знаёмай».

У 1842 г. падчас знаходжання ў Гародна, Анетка Патоцкая намалявала свой кабінет у палацы Гародна. Прафесар Зыгмунт Батоўскі, які ў 1930-х гг. вывучаў гэты палац, занатаваў, што кафляная печ у кабінеце мела зялёны колер і герб Ляліва.

У другім шлюбе ў Ганны нарадзілася дачка Матыльда. Гэты шлюб быў значна шчаслівейшым, чым першы, але сужэнцам прыйшлося з'ехаць у эміграцыю: Вансовіч актыўна ўдзельнічаў у паўстанні 1831 г. З 1851 г. графіня Ганна Дунін-Вансовіч разам з мужам жыве ў Парыжы, і яе парыжскі салон лічыцца адным з самых бліскучых ў Другой

Ганна Патоцкая-Вансовіч. Мастак Фларыян Ліпінскі

французскай імперыі. Графіня цалкам аддалілася ад так званай Вялікай эміграцыі і яе знакамітага штаба — гатэля «Ламбер». Тым не менш яна працягвала цікавіцца палітыкай, чытала літаратурныя навіны і часта гуляла на біржы. Верагодна, апошні ўспамін пра графіню Вансовіч паходзіць з 1863 г.: *«... Мяне ўразіў бляск яе вачэй, якія захавалі нешта ад яе маладосці»* (гэты радок быў выкраслены з прадмовы да ўспамінаў Анеткі выдаўцом Казімірам Стрыенскім).

Апошняя графічная выява Ганны Патоцкай-Вансовіч —

літаграфія жывапісца Фларыяна Ліпінскага (1812–1882), датавана 1836 г. і грунтуецца на малюнку мініяцюрыста і венскага партрэтыста Ёгана Непамука Эндэра (1793–1854). У рысах твару амаль што 60-ці гадовай жанчыны, апранутай у карункавы капот і захутанай ў муслінавы вэлюм, цяжка пазнаць маладую і жывую Анетку, увекавечаную на знакамітым партрэце Юзафа Грасі (1794) і ў мініяцюры Вінцэнта Лясэра, якая паўтарае гэты партрэт.

Памерла Ганна Патоцкая-Вансовіч у Парыжы 16 жніўня 1867 г. Сучаснікі высока ацанілі яе пачынанні. Юліюш Фалькоўскі пісаў: *«Яна была выдатным знаўцам усіх галін мастацтва, яна была добрым мастаком і яшчэ лепшым архітэктарам і садоўнікам, і калі яна стала гаспадыняй вялізнага маёнтка, уласнаручна складала планы будаўніцтва і перабудовы сваіх дамоў. У яе быў выдатны густ ва ўсім, яе меркаванне аб рэчах ніколі не было запазычаным, але развітым у ёй і заўсёды праніклівым і дакладным».*

У 1897 г., праз трыццаць гадоў пасля смерці Ганны Патоцкай-Вансовіч, у Парыжы былі апублікаваны яе ўспаміны[1]. У іх графіня Патоцкая (выдавец вывеў аўтарку пад прозвішчам, якое яна мела ў перыяд, апісаны ў мемуарах) распавядае пра Напалеона I і Аляксандра I, цікава апісвае імператрыцу Марыю-Луізу, маршала Мюрата, Паліну Баргезе, Талейрана, герцага Басано, вялікага князя Канстанціна, Навасільцава, князя Юзафа Панятоўскага, графіню Валеўскую і іншых. Хутка мемуары Ганны Патоцкай былі перакладзены на рускую мову[2], пасля чаго неаднаразова перавыдаваліся. Як я ўжо пісаў вышэй, таксама пасмертна, у 1899 г. былі апублікаваны яе дарож-

[1] Memoires de la comtesse Potocka (1794–1820), publies par Casimir Strienski. Paris. 1897.

[2] Гл: Мемуары графини Потоцкой // Исторический вестник, №4. 1897.

ныя запіскі пад назвай «Voyage en Italie» («Падарожжа ў Італію»).

НАСТУПНЫЯ ЎЛАДАЛЬНІКІ ГАРОДНА

Патоцкія ў Гародна бывалі эпізадычна, і таму з-за недахопу гаспадарчага нагляду і надта паспешнай будоўлі сцены паступова пачалі нахіляцца і патрабавалі рамонту. Ад зруйнавання сядзібу выратаваў Маўрыцый Патоцкі, які загадаў адрамантаваць дом і ашаляваць сцены дошкай. Унутры былі праведзены самыя неабходныя кансервацыйныя работы, але ні дарагая шаўковая і атласная абіўка, ні пазалота, ні ляпніна не былі адноўлены. Гэта не ўпрыгожыла дом, але забяспечыла яму доўгае жыццё.

Міхал Шымялевіч пісаў: *«Маю ў руках… асобнік урадавага раскладу набору 10 прац., ад даходу з польскіх маёнткаў Лідскага павета, ці, прасцей кажучы, кантрыбуцыі, накладзенай генерал-губернатарам Мураўёвым за 1863 г. З гэтага раскладу вынікае, што… Гародна графа Патоцкага плаціла 3844 рублі ў год, для параўнання Гарадзенка Людвіка і Юзэфы Кабылінскіх — 1797 руб., Вялікае Мажэйкава Рафала Грабоўскага — 1346 руб. 75 кап., Шчучын князёў Любецкіх — 2491 руб., Жалудок Германцыі Урускай — 4809 руб.».* Як бачым, у той час Патоцкія мелі другі па памерах маёнтак на Лідчыне. Заўважу, што ў 1896 г. прадзед маёй жонкі Марцін Хруль выплаціў у казну 2 рублі 90 капеек як падатак *«з маёнткаў асобаў польскага паходжання»* са свайго даходу ў памеры 42 рублі 70 капеек, які ён меў з 42 дзесяцінаў зямлі ў Воўкавічах і Ёдках[1], а Маўрыцый (Аляксандравіч) з Маёнтка Гародна памерам у 14783 ½

дзесяціны з даходу ў 21822,47 рублёў заплаціў 1483 рублі мураўёўскага падатку[2], як бачым, памер падатку зменшыўся з 10% да 6% і не цяжка заўважыць, што да канца XIX ст. памеры маёнтка паменшылі недзе на 30%.

Кантрыбуцыю, як называлі гэты падатак, хутка пасля таго, як узышоў на пасад, адмяніў цар Мікалай II, вось як гэта апісаў у сваіх успамінах Гіпаліт Корвін-Мілеўскі: *«Мікалай II наведаў Кіеў. Там, прыязджаючы ў нядзелю міма каталіцкага храма, ён убачыў вялікі натоўп вернікаў, якія маліліся на дварэ. Цар даведаўся, што ў Кіеве на некалькі дзясяткаў тысяч католікаў маецца толькі адзін касцёл, і загадаў пабудаваць другі за дзяржаўны кошт. Даведаўся таксама, што абшарнікі-католікі ўсё яшчэ плацяць кантрыбуцыю, накладзеную на іх трыццаць з лішкам гадоў таму пры Мураўёве. На ўрачыстым прыёме ён падышоў да пані Марыі Браніцкай з Белай Царквы і пасля некалькіх сказаных голасна слоў вітання, гучным шэптам спытаў: „Нехай графіня скажа мне, ці праўда, што польскія гаспадары яшчэ плацяць кантрыбуцыю, накладзеную ў 1863 годзе?“. „Найяснейшы пане, за гэтыя апошнія гады я мусіла заплаціць больш за 50 000 рублёў“. Пасля некалькіх іншых гучна сказаных слоў цар выйшаў з залы, а кантрыбуцыя была хутка скасавана».*

Ва ўласных маёнтках такія багачы не жылі — праводзілі час у Варшаве ці за мяжой. Мелі давер да сваіх эканомаў, чыім абавязкам было выцісканне з двароў і адсылка ўладальнікам максімальных даходаў. Пан з візітам прыязджаў рэдка, заставаўся на некалькі дзён і зноў з'язджаў. Менавіта так і рабіў *«знаны гуляка, уладальнік Гародна Аўгуст Патоцкі, які мог за адну ноч прайграць у карты свой*

[1] Виленские губернские ведомости. 1896. №53.

[2] Виленские губернские ведомости. 1896. №51.

найлепшы фальварак. Не дзіва, што яго маёмасць растала, як вясновы снег: першымі былі прададзеныя лясы, а сапраўдную каралеўскую рэзідэнцыю за малыя грошы купіў рускі генерал Асатураў», — пісаў сусед Патоцкага Тадэвуш Іваноўскі.

Мастак-баталіст Ян Багуміл Розен (1854–1936) у сваіх мемуарах піша пра паездку ў 1882 г. «да Аўгуста Патоцкага» і наведванне Гародна[1]:

«Маё грамадскае жыццё звязала мяне з Аўгустам Патоцкім, якога варшавяне ўсіх слаёў насельніцтва называлі «Гуцам». Малады арыстакрат быў агульна папулярны з-за свайго прамяністага нораву і лёгкасці кантактаў з людзьмі, такую папулярнасць надае ўпэўненасць у тым, што ніякая, нават самая сціплая кампанія, не прыносіць яму ганьбы. Быў ён гуляка вялікага стылю і гранд-сеньёр з ног да галавы, добра разумеў і цаніў мастацтва. Я быў у яго ў Варшаве і пазнаёміўся з яго маці.

<...>

Мне стала душна ў соннай Варшаве, і ўва мне зноў пачала пульсаваць тая жылка вандроўніка, якая шмат гадоў парушала штодзённы рытм майго жыцця.

На гэты раз я не паехаў далёка, але з ахвотай прыняў прапанову Аўгуста Патоцкага наведаць яго літоўскія маёнткі. Гэта былі землі маёнтка Гародна, якія дасталіся Патоцкім ад Тышкевічаў.

У Гародна мы ехалі праз Ліду. Я з асалодай пагрузіўся ў «пушч літоўскіх змрочныя абшары»[2] *і неўзабаве сталіца з яе мітуснёй, пакутамі і забавамі адышла ў маёй душы, нібы незлічоныя прастора і час аддзялілі іх ад мяне.*

---

[1] Jan Rosen. Wspomnienia 1860–1925. Warszawa,1933. S. 84–85; 89–91.

[2] Радок з 4-й кнігі «Пана Тадэвуш» Адама Міцкеіча, пераклад Пятра Бітэля.

Вонкавы выгляд старой рэзідэнцыі Тышкевічаў не ўяўляў з сябе нічога асаблівага, калі наогул можна назваць рэзідэнцый вялізны сядзібны дом з лістоўніцы, які аднак сам па сябе, з-за свайго плану і матэрыялу, з'яўляецца арыгінальным помнікам. Яго акружаў парк выкананы па строгім вярсальскім узоры. Уся мясцовая культура, мешаніна польскай традыцыі і французскай культуры, выражалася ў тыповым ганку на слупах, які глядзеў на французскую лінію стрыжаных дрэў у парку. Канешне, у парку драмалі ставы, дзе мусілі, ладзіцца «жабіныя канцэрты»... Усё было грандыёзным, вялікім, пакрытым павуціннем мінулага. А што знутры! Не зрушылі ніводнай мэблі, у параднай зале яшчэ стаяў трон, на якім сядзеў кароль Стась, калі ён некалі гасцяваў у гарадзенскага пана (насамрэч, кароль так і не наведаў Гародна — *Л. Л.)*.

Мэбля і цудоўныя жырандолі ў стылі Людовіка XVI адпавядалі карцінам, некаторыя з якіх былі бясцэннымі, напрыклад, копія «Шакаладніцы» жэнеўскага мастака Ліятара[1]*, якая адрознівалася ад арыгінала толькі колерам сукенкі шакаладніцы, арыгінал карціны зараз — уласнасць Дрэздан-скай галерэі.*

Мне здавалася, што ў гэтым зацвярдзелым аскепку шляхецкай мінуўшчыны знайду і іншыя цікавыя разынкі і артэфакты. Са згоды майго ласкавага гаспадара я пайшоў шукаць на гарышчы.

Гарышча было, як і ўсе гарышчы, пыльнае, цёмнае і вялізнае. Не мог сам сабе паверыць, што ў запале мастацкай цікаўнасці я не шукаў нейкія асаблівыя рэчы... Старыя та-

[1] Жан-Эцьен Ліятар (Jean-Etienne Liotard; 1702–1789) — швейцарскі мастак, майстар пастэлі, адзін з галоўных прадстаўнікоў арыенталізму ў заходнееўрапейскім мастацтве XVIII ст.. Маецца на ўвазе рэпліка знакамітай яго карціны «Шакаладніца» (1744 г., пастэль, зараз знаходзіцца ў Галерэі старых майстроў, Дрэздан).

ямніцы? Рэшткі мэблі, зброі? Схаваныя прывіды, якія ўсё яшчэ цікуюць за мной у цемры? Маўклівыя цені?

Я наткнуўся на вялізны скрутак, які аказаўся добра захаваным дываном д'Абюсон[1], *знайшоў набор духавых інструментаў аркестра гетмана Тышкевіча і два старыя капелюшы самога гетмана ці некага з яго прыдворных. Капелюшы сталі здабыткам даследчыка…*

На наступны дзень я выбраўся ў далейшыя пошукі і даследаванні і пачаў з спарахнелай цаглянай капліцы, якая стаіць побач з палацам. Перш за ўсё звярнуў увагу на прыгожую разьбяны драўляны амбон. Я зайшоў на яго і адразу праваліўся, як і належыць грэшнаму і цікаўнаму жывапісцу. Лежачы на падлозе зразумеў, што ніводная мая костка не зламаная. Тады неяк выйшаў на двор, паглядзеў прама ўніз і зрабіў новае адкрыццё. Ля падножжа капліцы, проста над зямлёй, мне бадзёра падміргвалі акенцы. Але жалезныя дзверы, зачыненыя на чатыры засаўкі, абаранялі доступ у падзямелле. Адміністратар гарадзенскай рэзідэнцыі пан Янушкевіч, пакліканы сюды па маёй просьбе, кляўся, што на яго памяці ніхто не адчыняў дзвярэй… шляхетны стары меў ужо больш за восемдзесят гадоў. Ён, як мог, бараніўся ад маёй настойлівасці, але ўрэшце саступіў. Прывялі кавалля, які з цяжкасцю адсунуў рыгелі. Мяне калаціла ад чакання! Нашы вочы ўбачылі сухую светлую піўніцу, высыпаную белым пяском. Каля сцяны стаяў шэраг пустых (на жаль!) бочак і ў адной з іх была стагадовая старка. Толькі гэта дасягненне было вартае каб зайсці сюды! Бочку ў годнай кампаніі з «Шакаладніцай» і дываном д'Абюсон даставілі ў

[1] П«ер д'Абюсан (1423–1503) — вялікі магістр ордэна янітаў (шпіталераў), кардынал Францыі. З яго імем звязана гісторыя габеленаў «Дама з аднарогам» з прыёрства Бурганёф, дзе ён быў пробашчам. Са старых часоў у г. Абюсон працавала фабрыка як насценных габеленаў, гэтак і дываноў. Фабрыка працавала да 1870 г.

Варшаву. Знайшлі яшчэ там з тузін бутэлек шампанскага. Мы кінуліся каштаваць яго, але былі расчараваныя, віно выветрылася ў нішто, гэта была проста газаваная вада.

Адпачыўшы ў Гародна, мы адправіліся ў аб'езд маёнтка. Падарожжа доўжылася каля шасці дзён. Гэта была непаўторная, поўная візуальных уражанняў вандроўка па лясістым, цудоўным краі, па дарогах, ад якіх сучаснаму аўтамабілісту стала б страшна. Арандатары жылі ў вялізных фальварках, цікавыя тыпажы літоўскіх засценкаў, некаторыя нібы проста выйшлі з «Пана Тадэвуша» — сардэчныя, простыя і гасцінныя! Як яны віталі дзедзіча! Якія прысмакі з'яўляліся на сталах! Якія вяндліны і выпечкі, якія мёды і наліўкі, якія кансервы (гэта тое, што сёння назвалі бы «закаткамі» — *Л. Л.*) *і канфіцюры! Наетыя і напітыя, расчуленыя гасціннасцю, мы, стомленыя і вельмі задаволеныя, працягвалі трэсціся па выбоістых літоўскіх дарогах, захопленыя прыгажосцю краявідаў і гасціннасцю людзей. Праз два тыдні гэтага цудоўнага адпачынку я вярнуўся ў Варшаву і пачаў марыць пра новае падарожжа сюды».*

Напрыканцы XIX ст. Аўгуст Патоцкі прадаў Гародна генералу Асатураву, ад якога маёнтак перайшоў да графа Ігнаццева, ад яго — да генерала Кандратовіча. Перад Першай сусветнай вайной, пасля пераводу ў Варшаўскую акругу, сям'я генерала Кіпрыяна Кандратовіча купіла маёнтак Гародна (500 га зямлі і лес) у Лідскім павеце, дзе Кандратовіч жыў разам з дачкой Верай і жонкай Адай.

У 1930 г. Кандратовічам таксама належаў маёнтак Зданаўцы (ці Здановічы) каля Ражанкі. Потым гэты маёнтак быў прададзены Юльяну Шчуку.

Гародна на малюнку Н. Орды, каля 1875 года. Палац, афіцына і капліца

СЯДЗІБНЫ АНСАМБЛЬ

Сядзібны ансамбль у Гародна стваралі тры суседнія будынкі: жылы палац, афіцына, якая стаяла насупраць, і мураваная капліца з правага боку.

Палац. Цэнтр кампазіцыі — драўляны, на высокім мураваным цокалі, двухпавярховы прамавугольны палац у стылі класіцызму (1780 г., архітэктар Ш. Цуг). Выцягнуты у прамавугольным плане палац меў два паверхі: нізкі першы, з адносна вялікімі квадратнымі вокнамі, у якім, акрамя гаспадарчых памяшканняў, знаходзіліся таксама некаторыя жылыя памяшканні, і высокага другога паверха з анфіладай жылых пакояў і пакояў гаспадароў. Фасады дома ў апошнія дзесяцігоддзі яго існавання ашалявалі до-

шкай, якая імітавала рустыку, гэта надавала будынку выгляд цаглянага.

Прасторны сядзібны дом меў франтальна выцягнутыя фасады. У цэнтры палаца вылучаўся рызаліт да якога прылягаў візуальна занадта цяжкі порцік з чатырма дарычнымі калонамі, якія звужаліся ўверх. Яны падтрымлівалі антаблемент з фрызам, трыгліфамі і плоскімі выступамі ў мятопах[1]. Паміж трохвугольным франтонам і антаблементам знаходзілася надбудова, магчыма, часоў рэстаўрацыі палаца. Гэта надавала порціку пэўную, візуальную няправільнасць, цяжкасць пры непрапарцыйна нізкіх калонах. На тымпане (унутраным полі франтона) знаходзілася тарча з гербом уладальнікаў. Пад порцік вялі авальныя пад'язныя дарожкі, апраўленая атынкаванымі сценамі. Па гэтых шырокіх бакавых пандусах пад порцік уязджалі карэты. Уваходам для пешых служыла лесвіца з некалькімі дзясяткамі прыступак насупраць галоўнага ўваходу. Перад порцікам мелася платформа з балюстрадай па абодва бакі.

Фасад палаца ў бок саду нагадваў галоўны. Адзіным адрозненнем была форма порціка, які з гэтага боку быў больш плыткім, а на трохвугольным франтоне замест герба меўся акулюс (круглая адтуліна, праз якую ўнутр пранікала святло). Да гэтага порціка прылягала шырокая тэраса, аточаная такой жа балюстрадай, як і тэраса галоўнага пад'езда. На тэрасу вяла лесвіца ў форме чвэрці круга

[1] Антаблемент — бэлечнае перакрыццё пралёта альбо завяршэнне сцяны. Фрыз — дэкаратыўная кампазіцыя ў выглядзе гарызантальнай паласы або стужкі, якая ўвенчвае або атачае тую частку пабудовы. Трыгліф — элемент фрыза дарычнага ордэра, які ўяўляе сабой вертыкальную каменную пліту з трохвугольнымі ў плане падоўжнымі жолабамі. Трыгліфы чаргуюцца з мятопамі. Мятопа — элемент фрыза дарычнага ордара ў выглядзе каменных або керамічных пліт, якія запаўняюць прамежкі паміж двума трыгліфамі.



Фасад палаца ў бок саду

з пятнаццаццю прыступкамі, к верху лесвіца паступова звужалася. Пярэдняя сцяна тэрасы мела тры паўкруглыя нішы. У крайніх нішах месціліся каменныя лаўкі.

Палац меў вальмовы дах з гонты, верагодна, нязначна зменены падчас рэканструкцыі будынка. Па абодва бакі ад порціка, а таксама ў бакавых схілах даху, месціліся нізкія, гарызантальна выцягнутыя люкарны (невялікія аконныя праёмы ў даху), праз якія асвятлялася гарышча.

Знутры палац меў падвойную планіроўку з цэнтральнымі калідорамі ў абодвух крылах будынка і ў цэнтры.

Паколькі палац адносна мала пацярпеў у часы Першай сусветнай вайны, калі было толькі разрабавана або знішчана унутранае ўбранне, захаваліся два інвентары палаца 1826 і 1866 г., а таксама фатаграфіі да 1939 г., таму можна скласці даволі падрабязнае ўяўленне пра

Палац з боку капліцы

тое, як выглядалі пакоі палаца на працягу XIX-га і пачатку XX-га ст.

Змест двух інвентароў істотна адрозніваюцца, бо шматлікія прадметы мэблі і мастацтва, якія мела Гародна, перамяшчаліся ці замяняліся новымі рэчамі. Многія з больш каштоўных прадметаў уладальнікі (у тым ліку і Ганна Патоцкая) вывезлі ў сваю варшаўскую рэзідэнцыю або на продаж у Вільню. Архіў маёнтка Аўгустам Патоцкім быў падораны Антонію Тышкевічу ў якасці сямейнай рэліквіі, і такім чынам на пачатку XX-га ст. архіў стаў часткай віленскай калекцыі сям'і Тышкевічаў. Дзякуючы мастаку Розену мы ведаем, што ў 1882 г. большая частка мэблі палаца і твораў мастацтва ўсё яшчэ знаходзілася на месцы, хоць тагачасныя ўладальнікі не зусім усведамлялі іх каштоўнасць. Напрыклад, Розен распавядае пра тое, як падчас агля-

ду дома на гарышчы быў знойдзены скрутак, які аказаўся арыгінальным дыванам з д'Абюсона (гл. вышэй). Гэта пралівае святло на ўзровень астатніх калекцый палаца, рэшткі якіх, пераважна ў выглядзе старадаўняй мэблі, захаваліся ў маёнтку да пачатку Другой сусветнай вайны.

Інвентары і іканаграфічныя матэрыялы паказваюць, штоадамашак пакоі палаца, асабліва прадстаўнічыя, былі ўпрыгожаны панэлямі і багатай мастацкай тынкоўкай у стылі Людовіка XVI і цікава, што адны і тыя ж матывы нідзе не паўтараліся. Большасць залаў і пакояў былі абсталяваны крышталёвымі люстрамі з пазалочанай бронзы ў стылі Людовіка XVI, белымі альбо мармуровымі камінамі, печамі рознай формы з прыгожай каляровай кафлі, упрыгожанай гербам Ляліва, ясеневымі падлогамі з вялікіх квадратаў, выкладзеных па дыяганалі. Сталярныя вырабы былі пакрытыя белым лакам, часта з пазалотай. Аднак, калі аўтарства праекта палаца асцярожна прыпісваюць Багумілу Цугу, дык імёны майстроў унутраных інтэр'ераў, верагодна, назаўсёды застануцца ананімнымі. Магчыма, гэта былі тыя ж самыя невядомыя майстры, якія працавалі над няскончаным палацам у суседніх Жырмунах, спраектаваным прыблізна ў той жа час, што і маёнтак Гародна.

Мэбля палаца таксама мела рысы стылю Людовіка XVI, хоць маглі прысутнічаць асобныя прадметы і часоў Людовіка XV. Мелася значная колькасць пазнейшай мэблі ў стылі ампір. Пра стыль мэблі можна даведацца з інвентароў, якія аднак, абмяжоўваюцца толькі павярхоўным апісаннем матэрыялаў, з якіх выраблены рэчы, гатунку лаку, пазалоты і бронзавых упрыгожанняў. Сітуацыя яшчэ горшая, калі гаворка ідзе пра творы мастацтва, у першую чаргу пра багатую галерэю карцін. Інвентары пералічваюць толькі колькасць карцін і ў лепшым выпадку ўказваюць іх памер і аправы — звычайна, пазалочаныя рамы «сніцарскай работы». Трошкі больш падрабязна апісваюцца толькі дэкаратыўныя фарфоравыя і фаянсавыя вазоны, але заўсёды

без указання фабрыкі. Толькі пры пераліку сталовага посуду ў буфеце, інвентары вызначаюць яго як кітайскі, саксонскі ў кветкі, берлінскі ўзорны, фаянс зялёны англійскі ці прускі.

У палац уваходзілі праз вялікую квадратную галоўную залу, якая, згодна з інвентаром 1866 г., верагодна, складзеным пасля рэстаўрацыі дома, мела сцены, пафарбаваныя ў светла-зялёны колер, і падлогу з мармуровых пліт. Вечаровае асвятленне ў зале спачатку забяспечвалася крышталёвым ліхтаром, падвешаным на кармазынавым шаўковым шнурку, пазней заменены на трохсвечкавую крыштальную жырандолю. Сярод мэблі ў зале меліся два круглыя альховыя сталы з шуфлядкамі і дзве сямімесныя канапы, кшталту крэслаў з таго самага ж дрэва, а таксама дзве канапы з двума сядзеннямі. Акрамя таго, на адпаведных пастаментах стаялі чатыры гіпсавыя бюсты.

Анфіладу правай, пярэдняй часткі палаца, стваралі чатыры пакоі. Першы, самы вялікі з іх, служыў бібліятэкай. Яго сцены былі пакрытыя шэрымі шпалерамі з кветкавым узорам, а наваксаваная падлога зроблена з хваёвых панэляў. Са столі ў 1826 г. звісала крыштальная жырандоля з пазалочанай бронзы і пяццю шклянымі падсвечнікамі, а ў 1866 г. — іншая, таксама крыштальная, з дзевяццю падсвечнікамі. Над пакрытым белым лакам камінам мелася люстэрка ў раме сніцарскай работы. Першапачатковы пазалочаны парыжскі насценны гадзіннік пазней быў заменены на гадзіннік на драўляным пастаменце. У першай палове XIX ст. бібліятэчны пакой выкарыстоўваўся як яшчэ адзін салон альбо як пакой для гульні ў карты, пра што сведчыць яго мэбля, якая складалася з квадратнага стала чырвонага дрэва з адкіднымі створкамі, другога шпонаванага, і трэцяга, таксама раскладнога стала з таніраванай вольхі. Меліся тут і адзінаццаць крэслаў чырвонага дрэва, абабітых скурай. Калі пакой пераабсталявалі ў бібліятэку, тут з'явіліся ча-



План палаца

тыры кніжныя шафы: дзве вялікія альховыя, адна малая шпонаваная, упрыгожаная бронзай, і чацвёртая з мармуровай стальніцай, усе абшытыя драцяной сеткай. Паколькі ў інвентары не згадваюцца кнігі, можна выказаць здагадку, што яны пералічваліся асобна. З часам, да гэтай мэблі было дададзена чорнае крэсла, абцягнутае пунсовай ваўнянай тканінай, а крэслы з чырвонага дрэва былі заменены на белыя лакіраваныя, з падушкамі ў палоску. Мастацкае ўбранне бібліятэкі ўзбагацілася чатырнаццаццю карцінамі рознага памеру, выкананых алеем, і чатырма гіпсавымі бюстамі.

Акрамя кніг тут захоўваўся багаты архіў дакументаў (з 1470 г.) усіх уладальнікаў маёнтка і іншых асоб. Пасля 1831 г. частка кніг перавезена ў Беласток у Інстытут паненак, які там ствараўся. Аўгуст Патоцкі прадаў маёнтак разам з кніжнымі зборамі і архівамі.

З бібліятэкі можна было ўвайсці ў пакой, размешчаны ў задняй палове дома, ці паслядоўна ў тры адносна невялікія пакоі, якія ўтваралі працяг правай пярэдняй анфілады, аддзеленай ад задніх пакояў калідорам. Першы з гэтых трох пакояў служыў гасцёўняй. Сцены ў ім былі абклеены жоўтымі папяровымі шпалерамі, падлога зроблена з ясеня, меўся пафарбаваны белым лакам камін, над ім вісела люстэрка апраўленае ў лакіраваную разьбяную раму. Мэбліроўка пакоя па стане на 1866 г. складалася з мэблі розных стыляў. Сярод іншага, тут стаяў шпонаваны пад чырвонае дрэва камод з чатырма шуфлядамі і верхам з каляровага мармуру, упрыгожаны бронзавымі элементамі, шэзлонг, абцягнуты белай тканінай, ложак з паліраванага капа (нарасту на бярозе), кутняя шафа з белай мармуровай панэллю, невялікая пафарбаваная канапа з блакітна-белай адамашкавай абіўкай, два белыя лакіраваныя крэслы з падлакотнікамі, абцягнутымі белым адамашкам[1] і пяць сталоў, чатыры з якіх — чырвонага дрэва, некаторыя ўпрыгожаныя бронзавымі элементамі, і пяты стол з таніраванай вольхі з чорнай скураной стальніцай. Падлога перад ложкам заслана каляровым, верагодна, усходнім дываном. Сярод твораў мастацтва меўся партрэт гетмана Тышкевіча і шэсць карцін рознага памеру. Гасцёўня таксама была ўпрыгожана трыма фаянсавымі вазонамі — з іх два пазалочаны а трэці ў кветкі на белым фоне. Далей ідуць дзве «фігуры», адна гіпсавая, устаноўленая на белым лакіраваным драўляным пастаменце, другая белая, на круглым пастаменце, які трымаю-

[1] Адамашак ці дамаст — дэкаратыўная тканіна (звычайна шаўковая), адна- або двухбаковая з малюнкам (часцей за ўсё кветкавым), утвораным бліскучым атласным перапляценнем нітак, на матавым фоне палатнянага перапляцення. Назва тканіны паходзіць ад горада Дамаск ў Сірыі.

ць якары. Лакіраваная лямпа на бронзавым пастаменце. Шкляны падсвечнік у аправе з пазалочанай бронзы, і нейкая, верагодна, асабліва каштоўная парцалянавая філіжанка з двума вушкамі, вечкам і пазалочаным сподкам.

Сцены суседняй спальні ў 1826 г. былі абцягнуты сінімі шпалерамі з каляровай аблямоўкай, а ў 1866 г. — новымі, зялёнымі ў лісце. Падлога, падобная як у суседнім пакоі. Люстэрка у пафарбаваных рамах, першапачаткова складалася з чатырох частак і стаяла на пастаменце. Пазней было заменена на іншае, у пазалочанай раме, вісела ўжо на сцяне.

Першапачатковы жалезны ложак быў заменены на паліраваны двухспальны з паліраванага капа. З іншай мэблі мелася альховая канапа і чатыры пафарбаваныя, абабітыя блакітна-белай льняной тканінай крэслы, а таксама два столікі. Тут вісела больш за дваццаць карцін, апісаных у першым інвентары як «гравюры на медзі», а ў другім, як «ландшафты тушшу». Чацвёрты і апошні ў правай анфіладзе кутні пакой, служыў гардэробнай і таму ў сваёй аздобе нічым не вылучаўся, тым не менш, быў стыльна абстаўлены.

У левай пярэдняй анфіладзе меліся тры вялікія пакоі, пазначаныя ў 1866 г. як: зялёны пакой, сталовая і кутні пакой. «Зялёны» пакой прылягаў да галоўнай залы і атрымаў сваю назву з-за колеру шпалераў з узорамі. У 1826 г. тут мелася крыштальная жырандоля ў пазалочанай бронзавай аправе з чатырма падсвечнікамі, а на сцяне вісела люстэрка ў разьбяной раме.

У 1826 г. сталовая мела лакіраваныя сцены колеру перлы, крыштальную жырандолю на шэсць свечак і пару пазалочаных бронзавых насценных жырандолей. Над камінам месцілася люстэрка з шасці частак у разьбяных, лакіраваных пад перлу рамах. Сярод іншага, тут меліся дзве канапы сніцарскай работы, пакрытыя белым лакам і пазалочаныя,

з кармазынавымі матрацамі ў пунсовыя кветкі, квадратны стол з чырвонага дрэва з бакавымі панелямі і другі, круглы з таго ж самага дрэва, два сталы з чырвонага дрэва з шуфлядкамі і стальніцамі, абабітымі зялёным сукном, дзесяць пафарбаваных белым лакам крэслаў з пазалочанымі падлакотнікамі, абабітыя турэцкай тканінай кармазынавага колеру ў пасы, і, нарэшце, шырма для каміна з чырвонага дрэва з зялёнай кітайкі (кітайскай баваўнянай тканінай). Упрыгожванне пакоя складалася з наступных прадметаў: гадзіннік з курантам на пастаменце з чырвонага дрэва з пазалочанай фігурай і дзесяццю вальцамі, тры парцаляновыя вазоны ў пазалочаныя кветкі, два пазалочаныя бронзавыя падсвечнікі і дзесяць карцін.

Апошні «кутні» пакой у левай пярэдняй анфіладзе, з адным акном у фасаднай сцяне і другім у бакавой, першапачаткова служыў канцылярыяй і таму меў уваход толькі з сярэдняга калідора. У 1826 г. ён быў абабіты «каляровым кардонам», а ў 1866 г. — палатном у кветкі. Там меўся жалезны камін і сходы, якія вялі прама ў камору на паддашку. Згодна з ранейшым інвентаром, у гэтым пакоі было шмат мэблі: стол з трыма шуфлядкамі і малы раскладны столік, абодва абшытыя шпонам пад чырвонае дрэва, пафарбаваная канапа з вольхі, абабітая блакітна-белай льняной тканінай у клетку, канторка з чырвонага дрэва з шуфлядкамі і адкідной дошкай, упрыгожаная бронзавымі элементамі, абшытая шпонам кніжная шафа з таніраванай алешыны з пяццю полкамі, пафарбаваны шэзлонг, абабіты, як канапа, чатыры меншыя белыя лакіраваныя крэслы і адно большае сніцарскай работы, абабітае блакітна-белай льняной тканінай, а таксама шостае з абцягнутымі скурай поручнямі, якое выкарыстоўвалася цырульнікам. На сценах пакоя віселі восем карцін і пяць гравюр. Сярод іншых мастацкіх прадметаў меліся два круглыя фаянсавыя вазоны з вечкамі ў кветкі на белым тле, гіпсавы бюст на пазалочаным пастаменце і некалькі канцылярскіх дробязяў.

Больш багата ўпрыгожаныя прадстаўнічыя пакоі знаходзіліся ў анфіладзе з боку саду. Яе цэнтр займала вялікая квадратная зала з закругленымі кутамі, асветленая трыма вокнамі, якія выходзілі на садовую тэрасу. У абодвух інвентарах пакой называўся «більярднай». Нягледзячы на тое, што ён меў прамое злучэнне з галоўнай уваходнай залай, быў аддзелены ад яе невялікім цёмным перадпакоем. У 1826 г. більярдная мела абіўку з «кітайскай паперы». У другой палове XIX ст. гэтая абіўка была заменена іншай, таксама папяровай, «светлай у кветкі», якая захавалася да 1939 г. Ніз сцен быў абшыты лакіраванымі панэлямі, а абіўка мела залатое аблямаванне. Уздоўж столі праходзіла паласа ляпніны. Насупраць цэнтральных дзвярэй знаходзіўся белы лакіраваны камін. Усю сцяну над камінам займала падвойнае люстэрка, апраўленае ў вузкія пазалочаныя ляпныя рамы. Прамавугольная прастора над люстэркам была запоўнена барэльефамі ў цэнтры якіх знаходзіўся авальны пазалочаны медальён з выявай купідона на каляснiцы, запрэжанай козамі. Над медальёнам меўся гарызантальны карніз, а пад ім тры пазалочаныя галовы авечак, злучаныя гірляндай. Два іншыя люстэркі, апраўленыя ў багатыя рамы, былі размешчаны ў прамежках паміж вокнамі. Іх вянчалі панелі з барэльефамі скрыжаваных калчанаў, лукаў, стрэлаў, паходняў і раслінаў, перавязаных стужкамі і гірляндамі з кветак. Стоячы перад камінам, справа ад вас знаходзілася паўкруглая ніша, у якой стаяла печ на ножках, зробленая з кафлі колеру селадону. Злева ад каміна знаходзіліся багата ўпрыгожаныя дзверы ў прадпакой, увянчаныя паўкруглымі гладкімі супрапортамі са сціплай пазалочанай гірляндай уверсе. На супрапорце мелася выява класічнай, таксама пазалочанай, вазы. Са столі звісала люстра з дванаццаццю свечкамі. Дзверы, якія вялі ў самы блізкі ў левай анфіладзе «другі зялёны пакой» а таксама на права, у «другую гасцёўню», былі ўвянчаны прастакут-

нымі супрапортамі. На пазалочаных круглых медальёнах, апраўленых з абодвух бакоў у галінкі, размешчаных на супрапортах, адлюстроўваліся сцэны гульняў купідонаў. Сярэдзіну гладкай столі займала круглая разетка з белага тынку. У адпаведнасці са сваёй назвай і прызначэннем, у гэтым пакоі стаяў більярдны стол з чырвонага дрэва, упрыгожаны бронзавымі элементамі. Для іншых забаў меліся шахматная дошка і «перспектыва з чырвонага дрэва з люстэркам». У 1826 г. з мэблі яшчэ былі чатыры круглыя стала з шуфлядкамі, два паўкруглых стала сніцарскай работы з белымі мармуровымі стальніцамі і адзін для кветак «з шуфлядкамі». Таксама мелася дзевяць крэслаў з падлакотнікамі, пакрытых белым лакам і пазалотай, абабітых турэцкім кармазынам. Камін засланяўся белай атласнай шырмай у арэхавых рамах з бронзавымі ўстаўкамі. Більярдную ўпрыгожвалі шэсць карцін рознага памеру, два белыя алебастравыя вазоны з вечкамі і чатыры чорныя бронзавыя бюсты на каміннай паліцы.

Першая ў правай анфіладзе з бока саду «другая гасцёўня», якая прылягала да бібліятэкі, мела ў 1826 г. «папяровую абіўку селадонавага колера» з узорам і белы, лакіраваны камін. У 1866 г. гэты пакой ужо быў абабіты зялёным адамашкам, у адным з кутоў меўся камін з белага мармуру, а ў процілеглым куце печ з гербам Тышкевічаў, падобную да той, якая была ў більярднай. Ніжнюю частку сцен пакрывалі белыя панелі, а абіўка сцен была апраўлена пазалочанымі ліштвамі, шырэйшымі, чым у більярднай. Уздоўж столі праходзіў вузкі, гладкі, белы карніз. Высокае, складзенае з чатырох частак люстэрка, месцілася паміж вокнамі і было ўвенчана ў верхняй частцы пласцінай з дзвюма скрыжаванымі харугвямі і гетманскай булавой. Па баках булавы меліся элементы герба Тышкевічаў, а менавіта паўмесяц і зорка. Над другім, большым люстэркам з шасці частак над камінам, у разьбянай, пакрытай белым лакам драўлянай раме, вісеў круглы ме-



Супрапорта і фрагмент упрыгожвання другога спальнага пакоя

дальён з выявай купідона, які распальвае агонь. Авальныя медальёны мелі выявы са звязанымі стужкай, скрыжаванымі стрэламі, калчанамі, шаблямі, сцягамі і г. д. якія запаўнялі супрапорты над дзвярнымі праёмамі. У «другой гасцёўні» стаялі два сталы, упрыгожаныя бронзай, адзін пазалочаны, паўкруглы з белай мармуровай стальніцай, другі з таніраванай вольхі з ножкамі з чырвонага дрэва. Далей стаялі дзве белыя лакіраваныя канапы, дзве малыя канапы і шэсць крэслаў з падлакотнікамі, усе абабітыя зялёным, у кветкі, адамашкам. Тут жа стаяў музычны інструмент, зроблены з таніраванага дубу. На сценах віселі вялікія віды Варшавы і дзве малыя карціны нявызначанай тэматыкі. Пара бронзавых пазалочаных падсвечнікаў, «падобных на вазоны», а таксама дзве малыя фаянсавыя вазы і адна з малюнкам навальніцы, дапаўнялі ўбранне пакоя.

Наступным у правай анфіладзе з боку саду знаходзіўся «другі спальны пакой». У 1826 г. ён быў абабіты сіняй паперай з узорам і меў камін пафарбаваны белым лакам. У 1866 г. абіўка стала больш вытанчанай, з зялёнага адамашку. Звяртала ўвагу прыгожае навершша люстэрка над камінам, першапачаткова апраўленае ў разьбяныя і лакіраваныя драўляныя рамы, а пазней убудаванае ў сцяну. Гэтае навершша-барэльеф мела выяву Афрадыты, якой купідон прапануе яблык, і месцілася ў прамавугольным полі пад выступаючым карнізам, які трымаўся на кансолях. На падобным па форме полі ў адной з супрапортаў, меўся іншы барэльеф, з кошыкам кветак у цэнтры, акружаны вянком паміж дзвюма скрыжаванымі пальмавымі галінамі. Над гэтым барэльефам таксама быў карніз з падвойным радам караляў паміж кансолямі. Белыя лакіраваныя дзверы мелі пазалоту. Бронзава-крыштальная жырандоля на чатыры свечкі дапаўняла мэбліроўку пакоя. Перасоўная мэбля гэтага пакоя, як і ва ўсіх астатніх, паступова змянялася. У 1866 г. яна складалася з: паліравана-

га ложка з капу, канапы абабітай зялёным адамашкам, якая раскладалася ў ложак, невялікага століка з чырвонага дрэва з бронзавым аздабленнем, гэты столік меў шафку з дзверцамі і стаяў каля ложка. Меўся яшчэ адзін столік, таксама з чырвонага дрэва, авальны, на дзвюх ножках і некалькіх крэслаў, абабітых адамашкам.

Гэты пакой быў упрыгожаны алейным партрэтам караля Станіслава Аўгуста і дзвюма фаянсавымі вазамі на каміннай полцы. У 1826 г. мэблі і прадметаў мастацтва стала значна больш, у тым ліку з'явіўся венскі раяль з чырвонага дрэва, камод з чырвонага дрэва, ўпрыгожаны бронзай, вялікая шафа з чырвонага дрэва з бронзай і іншыя рэчы. Тут жа стаяў бронзавы парыжскі гадзіннік з трыма статуэткамі.

Трэцім у гэтай анфіладзе быў невялікі пакой з адным акном, ён служыў «кабінетам». У 1826 г. сцены пакоя былі абцягнуты сінімі шпалерамі і драўлянымі панэлямі, меўся каменны камін з люстэркам у пазалочанай раме. У 1866 г. сцены «кабінета» пакрывала тканіна ў пазалочаных, на той час ужо пашкоджаных рамах. Свяцільнікі, дзверы і супрапорты былі таксама пазалочанымі. Мэбля гэтага пакоя ў 1826 г. абмяжоўвалася толькі канапай з матрацам, пяццю падушкамі і двума валікамі, абцягнутымі атласам, разьбяным альховым сталом і белым лакіраваным крэслам, абцягнутым палатном. Сярод твораў мастацтва, знойдзеных у кабінеце ў той час, у інвентары значацца жалезны крыж з фігурай Хрыста, дзве «гравюры» і карціна, якая апісваецца як «Кавярня ў чорнай раме за шклом». Верагодна, гэта была копія жэнеўскай «Шакаладніцы» Ліятара (гл. вышэй). Згодна з пазнейшым інвентаром, у гэтым пакоі, верагодна, знаходзілася яшчэ адна карціна алеем, а таксама клавікорд «старадаўні з чырвонага дрэва» на вольхавых ножках і фаянсавы вазонік для кветак.

Апошні, большы, выцягнуты ў даўжыню кутні пакой не згадваўся ў інвентарах, і таму ні яго мэбля, ні яго прызначэнне невядомыя.

У выніку перабудовы «кабінета», у 1826 г. паміж другой спальняй і кутнім пакоем знаходзілася невялікая «гардэробная», абабітая зялёнымі шпалерамі з узорамі, а ў 1866 г. пафарбаваная тэмперай. Сходы адсюль вялі наверх, у складское памяшканне. Мэбля пакоя істотна не адрознівалася ад мэблі ў іншых пакоях. У 1826 г. тут мелася канапа з таніраванай алешыны, абцягнутая сіняй і белай бавоўнай, таніраваная насценная шафа з пяццю полкамі, некалькі белых, лакіраваных крэслаў і крэслаў з чырвонага дрэва, раскладнога стала з таніраванай алешыны і люстэрка ў разьбяных рамах пакрытых белым лакам. На сценах у чорных зашклёных рамах віселі «розныя пейзажы».

Вялікі пакой з трыма вокнамі, які прылягаў да «більярднай», ці так званы «другі зялёны пакой» служыў яшчэ адной «гасцёўняй», відочна, што спадчыннікі Гародні, любілі ўсе адценні зялёнага. Згодна з інвентаром 1826 г. сцены тут былі пакрыты зялёным адамашкам, апраўленым у пазалочаныя рамы. У адным з кутоў там меўся белы мармуровы камін, упрыгожаны бронзавымі і чорнымі медальёнамі, у другім — печ з прыгожай кафлі. У 1866 г. замест адамашка ў гэтым пакоі была толькі шпалерная абіўка светла-зялёнага колеру. Як і іншыя прадстаўнічыя пакоі, ніз зялёнай гасцёўні пакрывалі панелі. Люстэрка над камінам было ўсталявана ў больш шырокую, чым іншыя, пазалочаную раму і ўвянчанае круглым медальёнам з выявай мужчынскай галавы, павернутай у профіль і ўпрыгожанай лаўровым вянком. Медальён месціўся над дзвюма скрыжаванымі галінкамі. Пад карнізам быў пазалочаны меандравы ўзор. У верхняй частцы прамавугольных супрапортаў, апраўленых у пазалочаныя рамы, меліся кошыкі з кветкамі, а ў ніжняй — невялікія пазалочаныя медальёны з выявамі гульняў купідонаў. Барэльефы панэляў, якія ўвенчвалі два люстэркі паміж вокнамі, былі апраўленыя ў пазалочаныя рамы, на іх меліся вазы з кветкамі на кансолях. Тут жа

вісела вялікая крыштальная люстра з дванаццаццю бронзавымі падсвечнікамі.

«Другі зялёны» пакой меў самую багатую і стыльную мэблю і творы мастацтва. З мэблі тут меліся дзве белыя лакіраваныя і пазалочаныя канапы, абабітыя зялёным адамашкам, два шпонаваныя камоды з бронзавымі ўпрыгожаннямі, чатыры сталы, два з якіх былі вуглавымі і пазалочанымі, адно раскладное крэсла з чырвонага дрэва, абабітае зялёнай тканінай, і адно круглае крэсла з чырвонага дрэва на трох ножках, восем падобна абабітых крэслаў, дзевяць крэслаў, пафарбаваных у белы і сіні колеры, і шэраг меншых прадметаў, такіх як альховыя кросны або жалезная рашотка пры каміне. Упрыгожванне пакоя складалася з чатырох партрэтаў: князя-падкаморага Казіміра Панятоўскага, гетмана Людвіка Тышкевіча і іх жонак. Далей стаяў неідэнтыфікаваны бюст з чорнага мармуру на пастаменце, дзве фігуры з белага мармуру на пастаментах, дзве ружовыя фаянсавыя вазы з узорамі ў кветкі і вечкамі, тры меншыя вазы, фаянсавыя падсвечнікі ў сінія кветкі, два мармуровыя падсвечнікі ў аправе з пазалочанай бронзы, два бронзавыя пазалочаныя падсвечнікі з эмаллю, а таксама каляровы турэцкі дыван.

Зялёны адамашак выкарыстоўваўся ў 1826 г. і ў наступным пакоі левай анфілады з боку саду. Гэты пакой быў адносна невялікім, хоць і асвятляўся, як і амаль усе іншыя пакоі ў палацы, праз два акны. Трэці пакой — «спальня» з альковам. Да 1866 г. абіўку тут змянілі на новую, таго ж колеру, але папяровую, з матывам вінаграднага лісця. Тут таксама меўся каменны камін і невялікая крыштальная жырандоля з чатырма бронзавымі падсвечнікамі. Прастору над камінам займала люстэрка ў пазалочаных рамах. Другое люстэрка ў такой жа раме вісела паміж вокнамі.

У спальні гаспадароў дома галоўным прадметам мэблі быў двухспальны, пазалочаны, драўляны ложак з зялёным балдахінам з адамашку ў белыя клеткі і з фіранкамі з

кітайкі. Балдахін быў увянчаны круглым пазалочаным кашом з пёрамі страуса. Паміж вокнамі стаялі дзве невялікія пазалочаныя шафкі, абабітыя зялёным саф'янам, за імі столік з чырвонага дрэва і чатырохногі палісандравы столік з бронзавым аздабленнем, з дзвюма белымі мармуровымі паліцамі. Мэблю спальні дапаўнялі два пазалочаныя крэслы з поручнямі, абабітыя зялёным адамашкам. Твораў мастацтва тут было мала, толькі адна карціна з невядомым сюжэтам і два бронзавыя «слупковыя» падсвечнікі ў форме вазонікаў.

Апошні ў левай анфіладзе з бока саду невялікі квадратны «кабінет» з адным акном у 1826 г. меў «белую палатняную абіўку з кветкамі», каменны камін і над ім занавешанае люстэрка ў пазалочанай раме. Пазней арыгінальная абіўка была заменена на паперу з кветкавым узорам. Мэбля кабінета складалася з пазалочанай канапы з матрацам на шэсць падушак, абабітага чырвонай тканінай у пасы, двух столікаў з чырвонага дрэва: круглага з бронзамі, чатырма шуфлядамі і зялёным бляшаным верхам, і невялікага з адной шуфлядкай, і нарэшце, з двух пазалочаных крэслаў, таксама абабітых чырвонай тканінай у пасы. Нейкая карціна і «гіпсавая фігура на пастаменце» з'яўляліся мастацкім аздабленнем пакоя.

Гэтым «кабінетам» завяршалася анфілада прадстаўнічых і жылых пакояў уздоўж садовага боку палаца. У левым куце дома таксама знаходзілася «гардэробная» няправільнай формы з адным акном у бакавой сцяне, але яна не мела дзвярэй, якія злучалі б яе з «кабінетам». Увайсці ў гардэроб можна было толькі з цэнтральнага калідора або са спальні. «Гардэробная» ў 1826 г. служыла пярэднім пакоем і была ўпрыгожана нейкім «пейзажам» у рамах з чырвонага дрэва, мела сцены абабітыя «зялёнай з узорам» тканінай, а ў 1866 г. — паперай селадонавага колеру. Месцілася яна ў тым куце палаца, адкуль лесвіца вяла ў два пакоі на гарышчы. Відавочна, што, акрамя вышэйзгаданай

Паркавы стаў, 1920-я гг.

мэблі і твораў мастацтва, у інвентар таксама ўваходзілі іншыя, меншая рэчы палаца, такія як шторы, жалюзі, шырмы, камінныя аксесуары, туалетныя і пісьмовыя прыналежнасці і г. д.

У напоўпадвальным першым паверсе, акрамя падсобных памяшканняў дзе захоўвалася мэбля і інш., меліся таксама жылыя пакоі для адміністрацыі і гасцей. Некаторыя з іх былі абстаўлены толькі крыху горш за верхнія пакоі. У адным з такіх пакояў сцены былі «абшыты дошкамі і пафарбаваны», гэта можа азначаць, што ён быў цалкам пакрыты драўлянымі плітамі і меў падлогу з ясеня, а ў другім пакоі сцены таксама былі абшыты дошкамі, але мелі яшчэ і пазалочаную ляпніну. Гэтыя пакоі былі абстаўлены мэбляй, падобнай на тую, якая знаходзілася ў верхніх жылых і прадстаўнічых пакоях. Яны таксама былі ўпрыгожаны люстэркамі ў багатых рамах і шматлікімі «пейзажамі» ў

пазалочаных рамах за шклом, «пейзажамі тушшу», нейкімі малымі пейзажамі і інш. Варта падкрэсліць, што ўжо ў 1826 г. у маёнтку была ўсталявана бляшаная ванна ў драўляным корпусе ў форме камода з бронзавымі ўпрыгожаннямі і вечкам, якое замыкалася. Такім чынам, у маёнтку меўся ванны пакой, які не часта сустракаўся ў іншых маёнтках таго часу. Першы паверх, таксама часткова займалі піўніцы, уваход у якія знаходзіўся пры галоўным порціку.

Афіцына. Размешчаная насупраць палаца вялікая, аднапавярховая, драўляная афіцына выглядала сціпла. Гэты будынак у форме прамавугольніка не меў падмурка, быў накрыты вельмі высокім, гладкім, вальмавым дахам, характэрным для XVIII ст. з дзвюма люкарнямі, падобнымі на люкарні галоўнага корпуса. Флігель меў светлыя тынкаваныя сцены. Галоўны ўваход, размешчаны строга пасярэдзіне, не быў падкрэслены ні порцікам, ні якім-небудзь абрамленнем.

Цагляная капліца ў стылі позняга віленскага ракако стаіць недалёка ад палаца. Яна несумненна з'явілася раней за палац і магчыма была часткай ранейшай рэзідэнцыі. На сярэдзіне фасада капліцы маюцца сціплыя пілястры з ракаковым дэкорам. Характэрнай для гэтага стылю з'яўляецца і форма аконных праёмаў на фасадзе. Над выступаючым карнізам узвышалася вежачка з гербам, увянчаным сігнатуркай у форме мітры (нагадвае біскупскую мітру).

Аднанефавы ўнутраны інтэр'ер капліцы вылучаецца стрыманым ракаковым дэкорам сцен, падзеленых вертыкальна пілястрамі. Хор з яго звілістымі выгнутымі лініямі падтрымліваўся двума калонамі, якія стаялі вольна, і двума прысценнымі калонамі. Розен згадвае прыгожы, разьбяны, драўляны амбон. У момант яго візіту капліца, відаць, не выкарыстоўвалася і нават не абслугоўвалася, бо

дно амбона пад ім абвалілася. Аднак Генрык Марконі раней усё ж правёў некаторыя рэстаўрацыйныя работы ў капліцы.

Ландшафтны парк хутчэй за ўсё, быў створаны адначасова з пабудовай сядзібы або, магчыма, перапрацаваны з раней існага саду. У 1784 г. яго даглядаў І. Л. Кнакфус, які, магчыма, і быў яго стваральнікам. Першапачаткова парк меў барочны характар, які ўсё яшчэ бачны ў 1882 г., у тым ліку і ў форме падстрыжаных дрэў. Розен сцвярджаў, што парк створаны па ўзоры садоў Вярсаля. У любым выпадку, да самага канца заставалася выразна акрэсленай яго восевая планіроўка. Галоўная частка парку знаходзілася за палацам. З вокнаў і тэрасы палаца адкрываўся від на прастакутны канал (стаў), пракапаны ўздоўж восі парку і на процілеглым беразе, круглую альтанку з шасцю калонамі і плоскім дахам, акружаным зубчастай галерэяй. Побач з іншымі старымі, пераважна лісцянымі дрэвамі, якія атачалі круглы газон перад палацам, сам палац, афіцыну і капліцу, а таксама шпалеры дрэў па абодва бакі става, да 1939 г., тут захаваўся шэраг старажытных каштанаў.

Сядзіба ў Гародна была трагічна спалена 2-м батальёнам Віленскай АК падчас нападу на нямецкі гарнізон[1]. Пры гэтым шмат рэчаў з палаца разнеслі мясцовыя жыхары.

Вось у гэтым прыгожым маёнтку і прайшлі апошнія гады жыцця беларускага генерала Кіпрыяна Кандратовіча.

Пра гэтыя гады распавёў былы памочнік садоўніка маёнтка Струкель Уладзіслаў Янавіч (1916 г. нар., у 1939 г. жаўнер, абаронца Варшавы).

[1] Гл.: Roman Aftanazy. Dzieje rezydencji. T. 4. S. 122–139.

Гародна, парк, да 1939 г.

Сям'я Кандратовічаў вызначалася інтэлігентнасцю і добразычлівасцю да людзей. Сам генерал карыстаўся расійскай, беларускай, польскай мовамі ў побыце, у залежнасці ад абставін. Можна меркаваць, што адносіны з навакольнымі абшарнікамі не склаліся, і блізкае сяброўства ўсталявалася толькі з нейкім уладальнікам сядзібы каля Малога Мажэйкава. Госці прыязджалі з Варшавы, Францыі і Іспаніі, дзе жылі сваякі жонкі Ады. Дачка Вера атрымала хатнюю адукацыю і выйшла замуж за мастака з Англіі, іспанца па паходжанні, Трыстама Рэйні (Tristam Reiney), з канца 1930-х і да смерці ў 1988 г. жыла ў Англіі[1].

У жніво жонка Ада сустракала кожныя першыя вазы з падзякай да сялян і келіхам гарэлкі. Сам Струкель, тады яшчэ малады хлопец, атрымліваў заробак у памеры 90 пудоў жыта ў год плюс корм для жывёлы і бульбу, колькі трэба. Асабліва жонка генерала сачыла за прыгажосцю і парадкам у парку, сваім доме і ў дамах, дзе жыла прыслуга. Людзі, якія працавалі ў Кандратовічаў, атрымоўвалі беспрацэнтныя крэдыты на развіццё гаспадаркі, і, калі гаспадары бачылі, што грошы ўкладзены з розумам, крэдыт спісваўся.

Апошнія гады Кандратовіч правёў у інвалідным крэсле, хварэючы стратай каардынацыі руху. Ён не мог хадзіць, і жонка наняла сталую прыслугу. Памёр генерал Кандратовіч 31 кастрычніка 1932 г., быў пахаваны ў тым самым мундзіры, у якім быў паранены ў 1905 г. Пахаванне адбы-

[1] Вера Кандратовіч пазнаёмілася з Трыстамам Рэйні падчас знаходжання ў Іспаніі, дзе яна гасцявала ў свайго дзядзькі Уладзіміра Гвідавіча Рыхтара. Каля яе ў кафэ страціў прытомнасць малады іспанец, і Вера была сярод тых, хто аказаў яму першую дапамогу. Першы ўнук генерала — Георгій — нарадзіўся ў Заходняй Беларусі, наступныя, Мікалай і Аляксандр — у Англіі.

лося на лідскіх праваслаўных могілках на ганаровым месцы каля царквы св. Георгія.

Віленская газета «Слова» на пачатку лістапада 1932 г. надрукавала аб'яву пра смерць былога міністра абароны БНР Кіпрыяна Кандратовіча: *«Генерал ад інфантэрыі рускай арміі, кавалер ордэна св. Георгія і вялікай стужкі Ганаровага легіёна, пасля доўгай і цяжкай хваробы ціха заснуў з Богам 31 кастрычніка гэтага года ў сваім маёнтку Гародна. Быў пахаваны на праваслаўных могілках у Лідзе. Аб чым з глыбокім смуткам паведамляюць жонка і дачка»*[1].

Кандратовічы мелі аўтамабіль, у 1934 г. за Адай Кандратовіч быў зарэгістраваны амерыканскі аўтамабіль «Авэрлэнд» (Overland), а ў 1936 г. польскі «Фіят». У яе маёнтку меўся адзіны ў Гародна тэлефон, які меў №3.

Вядомы пісьменнік Мельхіёр Ваньковіч у ліпені 1937 г. пасля наведвання Гародна, надрукаваў нарыс з фотаздымкамі палаца і маладых сужэнцаў Рэйні. Фрагменты нарыса прыводжу ніжэй:

«Вось і двор у Гародна. Прыгожы порцік, былая рэзідэнцыя Скуміна-Тышкевіча, сядзіба, якая дачакалася манаграфіі прафесара Батоўскага[2].

Дзве дамы спускаюцца па шырокіх сходах. Маці з дачкой. Маці, у дзявоцтве з дому Курляндскіх баронаў, удава генерала Кандратовіча[3], *генерал перад вайной камандаваў корпусам, які стаяў у Варшаве*[4].

---

[1] Słowo. №277 (3084), 4 listopada 1932.

[2] На жаль, манаграфія не была напісаная, і я прапрацоўваў нататкі да манаграфіі. Калі глядзець па іх, дык да заканчэння манаграфіі было яшчэ далёка. Верагодна, пра манаграфію пр. Батоўскага Ваньковічу паведамілі Ада ці Вера Кандратовічы.

[3] Ада фон Рыхтар (1879 (?) — 1954). Ада Гвідаўна фон Рыхтар (Ada von Richter) — дачка расійскага генерала фон Рыхтара, нарадзілася ў Рызе,

Дачка, худзенькая паненка, выбачайце, замужняя жанчына, бо ў Іспаніі пазнаёмілася і прывезла адтуль ірландца, за якога выйшла замуж. Гэта называецца «ісці ў прымы», а таго, хто прыйшоў на гаспадарку жонкі, называюць «прымак». У адной са школ мне паказалі практыкаванне, у якім вучань называў Ягайлу «прымаком». Забіраем ірландца з павільёна, дзе ён малюе, і ідзём разам піць чай на тэрасе. Скрозь вінаграднае лісце прасочваецца перспектыва далёкай сажалкі. Размова на тэрасе, да якой далучаецца яшчэ нейкая кузынка, ідзе на ўсіх мовах, якія я ведаю ці не ведаю.

Дамы размаўляюць са мной па-польску, украпваючы шмат французскіх слоў, з ірландцам — па англійску, на першым паверсе аказваецца яшчэ нейкі «роттмістр» якому пасылаюць гарбату і з якім, напэўна, размаўляюць па-руску.

У вялікіх залах палаца спыняемся ля пазалочаных барэльефаў, якія, як кажа жонка генерала, яшчэ Тышкевіч «на конях прывёз з Парыжа».

І калі пад гэтымі барэльефамі наступае ўрачыстая сцэна цалавання духмяных ручак і развітання, і калі генералава Кандратовічава, de domo Freifrau курляндскіх (з дому курляндскіх баронаў — Л. Л.), вытанчана прыжмурыўшы вочы, пытаецца, куды мы цяпер паедзем, напэўна чакаючы, што мэта нашага падарожжа будзе годнай, кармазынавай[5]*, адказваю:*

— Да пана Спузяка.

Задрыжэла ў руцэ батыставая хустачка.

выпускніца Смольнага інстытута ў Санкт-Пецярбургу. У 1912 г. у Тыфлісе нарадзілася дачка Вера. Бацька Ады — генерал-лейтэнант Гвіда Казіміравіч Рыхтар, саслужывец генерала Кіпрыяна Антонавіча па Туркестане.

[4] 15 жніўня 1913 г., у прадчуванні вайны, Кандратовіч прызначаецца камандзірам 23-га армейскага корпуса 2-й арміі.

[5] Кармазынавы колер — ярка-чырвоны колер, кармазын — каштоўная чырвовая тканіна, адсюль: кармазын — заможны шляхціц, у дад-

— Mais c'est un voleur! (фр. *«Але ж ён злодзей!» — Л. Л.*).

— Што рабіць, ласкавая пані, журналіст мусіць таксама цікавіцца і крымінальнымі сюжэтамі…»[6].

Мастак, рэстаўратар, гісторык мастацтва і дацэнт Віленскага ўніверсітэта Ежы Хопен (Jerzy Hoppen, 1891–1969), які ўвосень 1938 г. гасцяваў у гаспадыні маёнтка Гародна Ады Кандратовіч, вывучаў палац і напісаў цікавы нарыс «Гародна, няспраўджаная рэзідэнцыя Станіслава Аўгуста» ў віленскай газеце «Слова»:

«Сярод нашых шматлікіх гістарычных сядзіб самай прыгожай і захаванай з'яўляецца драўляная сядзіба-палац у Гародна. Самая галоўная асаблівасць палаца, гэта яго стыль часоў караля Станіслава. Стыль выпраменьвае кожная дэталь архітэктуры. Гэта яшчэ адзін доказ уплыву караля Станіслава Аўгуста на ўсе галіны мастацтва. На жаль, Гародна яшчэ малавядомае, недаследаванае і навукова не апісанае. І гэта пры тым, што яно несумненна звязана з Варшаўскім замкам і Лазенкамі. Пры бліжэйшым вывучэнні гэта несумненна пацвердзіла стылёвая блізкасць інтэр'ераў.

Вялікі аднапавярховы дом, пабудаваны на невысокім узгорку, з велічным ганкам, манументальнымі сходамі і высокай пад'язной дарожкай, проста ўражвае сваім выглядам.

Гародна знаходзіцца за 25 кіламетраў ад Ліды і за 12 кіламетраў ад Эйшышак. Некалі было спадчыннай уласнасцю Саламеі княгіні Радзівіл з Сапегаў і ў 1762 г., падаравана ёю Людвіку Скуміну Тышкевічу. Людвік Скумін Тышкевіч — пісар Вялікага Княства Літоўскага, польны гетман і маршалак, абраў Гарадна сваёй рэзідэнцыяй. Ён

зеным выпадку, выказваецца надзея на высакародны працяг падарожжа.

[6] Wańkowicz Melchior. Nowy indygenat // Kurjer Poranny. 11 lipca 1937.

Вера Рэйні (Кандратовіч) разам з мужам

быў жанаты з Канстанцыяй княжной Панятоўскай, дачкой Казіміра Панятоўскага, брата караля Станіслава Аўгуста.

Атрымаўшы абяцанне прыезду караля, Тышкевіч пачаў рыхтавацца да высокага госця. За адзін год ён пабудаваў дом і драўляную сядзібу, якую з пышнасцю аздобіў. Мясцовая легенда кажа, што дзеля гэтага ў Гарадна выклікалі майстроў, а ўбранне інтэр'еру прывезлі з Парыжа.

З-за ўнутрыпалітычных падзей каралеўскі візіт не адбыўся.

Памёр Тышкевіч у 1808 г. Пасля яго Гародна перайшло да яго дачкі Ганны, у першым шлюбе яна была за гр. Аляксандрам Патоцкім, у другім за гр. Дуніным-Вансовічавам. У 1856 г. Ганна Дунін-Вансовіч аддала Гародна свайму сыну ад першага шлюбу графу Маўрыцыю Патоцкаму. І праз сто гадоў пасля пабудовы дома, гр. Маўрыцый выявіў, што ён усё яшчэ знаходзіцца ў добрым стане, але зрабіў некаторыя папраўкі і рамонты. Памяняў шалёўку і паправіў прасеўшыя сцены. Нажаль, прыгожыя падлогі ўжо згнілі, як і шоўк, які пакрываў сцены. Аднак ляпніна і пазалота захаваліся.

Гародна захавалася да нашых дзён і зараз з'яўляецца маёмасцю жонкі генерала Кандратовіча.

Акрамя выдатнага жылога дома гарадненскі двор складаецца яшчэ з найпрыгажэйшага парку і капліцы, не кажучы пра таксама старыя, але звычайныя гаспадарчыя пабудовы.

У парку маецца штучны стаў у форме вельмі выцягнутага простакутніка, пры канцы става — вялікая альтанка на мураваных калонах.

Жылы дом — цудоўны ўзор станіславаўскага стылю (часоў караля Станіслава Панятоўскага — *Л. Л.*). *Спераду ён мае высокі пад'езд і ганак на калонах. Знутры прасторны, з высокай столлю, з камінамі той эпохі, кафлянымі печамі XVIII ст. з гербам Тышкевічаў «Лялівай». Сцены, калісьці абабітыя ядвабнай тканінай, сёння выклеены шпалерамі, але захаваліся рамы і ліштвы, на якіх трымалася ядваба. Дзверы, супрапорты і рамы ад люстэркаў таксама добра захаваліся. Усё гэта сніцарскай работы, выканана з дрэва ці з адмысловай масы, мае белы колер з пазалотай і нясе на сабе адбітак таленавітага майстра і архітэктара. Невядома, ці сапраўды яны паходзяць з Парыжа, як кажа паданне. Ва ўсякім разе, гэта работа не нейкага правінцыйнага майстра, а таленавітага і высокакультурнага мастака. Пано, міфалагічныя сцэны і алегорыі, якія вянчаюць рамы*

люстэркаў, інтэграваныя ў супрапорты, поўныя стылёвай экспрэсіі. У іх ёсць нейкая вытанчанасць і лёгкасць, ад іх вее добрым густам і салоннай атмасферай.

Аднак Першая сусветная вайна не пашкадавала Гародна. Удава генерала расказала даследчыку, што ў гэты час была вывезена ў Германію ўся бронза. На дзвярах засталіся сляды ад ранейшых клямак і акуццяў, а на прыгожым мармуровым каміне — толькі адтуліны ад цвікоў, якімі была прымацавана дэкаратыўная бронза. Аднак над камінам захаваўся медальён з залатой аздобай з выявай галавы Станіслава Аўгуста. З мэблі немцы пакінулі некалькі крэслаў і фатэляў у стылі Людовіка XVI і столікі пад люстрамі.

Варта звярнуць належную ўвагу на тое, што цяперашнія гаспадары Гародна ў поўнай меры ўсведамляюць каштоўнасць гэтага помніка і беражліва яго даглядаюць. Усё ўтрымліваецца з незвычайным піятэтам да твораў мастацтва.

Каля дома стаіць вялікая мураваная капліца, а дакладней касцёл у т. з. стылі віленскага барока. Верагодна, капліца мае больш ранняе паходжанне і таму не мае нічога агульнага са станіславоўскім стылем. Яе фацыята (паддашак — *Л. Л.*) *крыху трансфармавалася і мае ўверсе сігнатурку* (невялікая вежачка — *Л. Л.*). *На фасаднай надбудове — выраблены з тынку барэльеф з трыма гербамі фундатараў, сярод якіх, аднак, няма «Лялівы» Скуміна-Тышкевіча.*

Унутры капліцы добра захаваўся багаты алтар і вельмі цікавыя хоры, абапёртыя на слупы, якія нагадваюць такія ж у віленскім касцёле св. Духа. Падлога з цэглы. Стыльная фурнітура ў стылі ракако на дзвярах. Гэтая капліца, несумненна, мае агульныя рысы з архітэктурай віленскіх касцёлаў.

Увесь гэты прыгожы маёнтак, які складаецца з сядзібы, старых каштанавых алей у парку, мураваных лаў і да нашага часу рэгуляванага става з альтанкай, адлюстроўвае эпоху, ахінутую моцным захапленнем да асобы караля, з якім гэтак арганічна асацыявалася прыгажосць»[1].

17 верасня 1939 г. Ада Кандратовіч вымушана была з'ехаць праз Літву да дачкі ў Англію. У жніўні 1998 г. яе ўнук прыязджае на Беларусь дзеля перазахавання труны генерала на новых могілках у Воранаве. А урну з часткай праху сваёй маці, якая пражыла найлепшыя гады маладосці ў маёнтку Гародна, пахаваў у прыгожым кутку парку, каля былой альтанкі. На крыжы было напісана: «Вера Киприяновна Рейни (Кондратович) 1912–1988». У траўні 2000 г. труна з парэшткамі генерала была перазахавана каля царквы ў Воранаве. Але даўно выспела неабходнасць вярнуць парэшткі беларускага генерала ў Ліду, туды дзе ён сам хацеў быць пахаваным і дзе яго пахавала жонка і дачка.

* * *

Першы раз я прыехаў сюды ў 2000 г., калі шукаў сляды генерала Кандратовіча. Сёння ад маёнтка засталіся капліца і знявечаны парк, у якім, аднак, жыве шляхетны дух старых часоў.

Парк у Гародна быў для мяне самым улюбёнае месцам гістарычнай Лідчыны. У адной з усходніх рэлігій, Сусвет створаны персальна для цябе як дэкарацыя і поле для творчасці. Тут я прыдумаў для сабе казку і нейкі час нават лічыў, што менавіта тут знаходзіцца маё «месца сілы». Потым, тры разы запар прайшоў праз кругі пекла, чым пацвердзіў старую максіму, што Сусвет уладкаваны больш проста, крыўдна і не для інтэлектуалаў. Дадаў бы яшчэ, больш смешна... Дваццаць гадоў таму гэта стала б для мяне карысным вопытам, а зараз толькі той стрэмкай у душы, з якой і нарадзіўся гэты тэкст, які стаў развітаннем з пустатой, з Гародна і заканчэннем аднаго з апошніх перыядаў майго жыцця.

---

[1] Jerzy Hoppen. Horodno, niedoszła rezydencja Stanisława Augusta // Słowo. №271 (5195). 3 października 1938.

ДАДАТКІ

Ада Кандратовіч і яе дачка Вера працяглы час перапісваліся з варшаўскім прафесарам Зыгмунтам Батоўскім (1876–1944), які рыхтаваў матэрыялы да манаграфіі пра маёнтак Гародна. Манаграфія не была надрукавана, але матэрыялы прафесара патрапілі ў архіў Польскай акадэміі навук і ў адсканаваным выглядзе з'явіліся ў вольным доступе[1]. У архіве маецца і ліставанне з віленскім кансерватарам (асоба, адказная за захаванне помнікаў гісторыі) др. Станіславам Лорэнцам.

Прапаную некаторыя з лістоў у перакладзе з польскай і англійскай моваў.

«Гародна каля Ліды, 02.03.1937.

Шаноўны пан прафесар (Батоўскі — *Л. Л.*).

Так шкада, што пан быў хворы, калі мы былі ў Варшаве. Маю надзею, што зараз пан прафесар адчувае сябе добра.

У Варшаве мы бавіліся не доўга. Магчыма ў маі зноў прыедзем і тады, можа, убачым пана прафесара. Былі ў Мастацкім салоне на выставе 1937 г., якую адчыніла Таварыства заахвочвання прыгожых мастацтваў. … мяне і мужа вельмі зацікавіла гэтая выстава. Ён нават даведваўся, ці можа і яму даслаць некалькі сваіх карцін на наступную выставу.

[Далей прасіць даведацца, што для гэтага трэба зрабіць. Таксама просіць прыехаць да іх улетку.]

Вельмі б цешыліся сустрэцца з панам і паказаць, як сёння выглядае дом….

Вера Рэйні.»

Дырэктар архіва Вацлаў Слядзінскі ад 27 лістапада 1931 г. адказвае на запыт прафесара Зыгмунта Батоўскага аб магчымасці знаходжання ў Віленскіх архівах дакумен-

[1] Archiwum PAN (Polska Akademia Nauk). 302/126/0/3/48.

таў Людвіка Тышкевіча, датычных да будаўніцтва палаца ў Гародна.

«Вельмі шаноўны пан прафесар.

Даведаўся ад п. Люцыяна Уземблы[1]*, што радавы маёнтак у спадчыннікаў Людвіка Тышкевіча разам з вельмі багатым і каштоўным архівам набыў гр. Бенедыкт Тышкевіч*[2] *з Чырвонага Двара, які частку свайго архіва (невядома якую частку і што менавіта) з Чырвонага Двара, што пад Коўняй, падобна, уратаваў ад канфіскацыі літоўскім урадам і схаваў недзе ў Варшаве. Жонцы гр. Тышкевіча ў сваёй бібліяграфіі выказаў падзяку Эстрайхер. Лічу, што пану прафесару не цяжка будзе адшукаць у Варшаве гр. Бенедыкта і атрымаць дакладную інфармацыю пра архіў Людвіка Тышкевіча. Ведаю, што частка архіва з Чырвонага Двара знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве ў Коўні.*

Вацлаў Слядзінскі».

«Гародна к. Ліды, 13 сакавіка 1936 г.

(Ліст на англійскай мове на двух аркушах з блакнота).

Шаноўны пан (Батоўскі — *Л. Л.*). *Перадаю вам шмат цёплых слоў. Мая дачка мела цудоўнае вяселле на прыродзе ў Англіі. Зараз сужэнцы бавяць доўгі мядовы месяц у паўднёвай Францыі. Я ўладкавала дом (ванны пакой, каналізацыю) і буду рада бачыць вас ў маі. Трыстан Рэйні* (муж Веры — *Л.*

[1] Узембла Люцыян (1864–1942) — публіцыст, дзеяч культуры, бібліяфіл; у 1906 г. адзін з ініцыятараў і сябар кіраўніцтва Таварыства музея навукі і мастацтва ў Вільні; у 1908–1914 гг. захавальнік музея; у 1914 г. кнігазбор Таварыства быў перададзены ў бібліятэку Таварыства сяброў навукі ў Вільні; у 1919–1922 гг. малодшы асістэнт на кафедры гісторыі культуры факультэта гуманістыкі УСБ. Усё жыццё збіраў кнігі, старадрукі.

[2] Бенедыкт Тышкевіч (1801–1866), літоўскі арыстакрат, граф, ковенскі губернскі маршалак, уладальнік Чырвонага Двара, калекцыянер і мецэнат. Бенедыкт Тышкевіч праславіўся як пакупнік карціны «Стэфан Баторы пад Псковам» Яна Матэйкі, набытай за 60 000 франкаў.

Л.) *цудоўны англійскі хлопец з незалежным характарам, ён мастак з вялікімі мастацкімі здольнасцямі, калекцыянер паштовых марак і аматар нашай мясцовай гісторыі, што будзе добра для іх, бо яны збіраюцца жыць разам у Гародна. Я вельмі спадзяюся, што вы наведаеце нас яшчэ раз, калі дом будзе выглядаць прыгожа з новай мэбляй. Маю надзею, вы прыедзеце да нас з Варшавы. З найлепшымі пажаданнямі і ўдзячнасцю.*

Ада Кандратовіч

Калі вы нешта напішыце пра Гародна?»

Ліст на англійскай мове на двух фірмовых аркушах маёнтка Гародна (у верхнім левым куту друкарскім шрыфтам набрана «Horodno k/Lidy»).

«27.01.1937.

Дарагі пр. Батоўскі.

Дзякуй за ласкавае віншаванне з нашым вяселлем, якое вы зрабілі ў лісце да маёй маці. Як вы напісалі па-англійску, наша вясельнае падарожжа — сапраўдная мастацкая з'ява, вам можа быць цікава даведацца, што мой муж — малады мастак і ён быў бы рады пазнаёміцца з вамі. Мы прыедзем у Варшаву ў «Еўрапейскі гатэль» 31 студзеня. Ці маглі б вы паведаміць нам, ці зможам мы сустрэцца?

З нецярпеннем чакаю, сустрэчы з вамі.

Вера Кандратовіч Рэйні».

ЗДЫМКІ МАЁНТКА, ДАСЛАНЫЯ ДР. ЛОРЭНЦАМ ПР. БАТОЎСКАМУ Ў ЖНІЎНІ 1933 Г.

04.02.1937 г.

Запіска алоўкам на англійскай мове, у якой прафесар выбачаецца за тое, што не змог зладзіць сустрэчу з сужэнцамі Рэйні, бо захварэў на грып. Прафесар выбачаецца, што будзе пісаць па-польску, бо яго англійскай мовы хапае толькі, каб чытаць і разумець, а не пісаць. Паведамляе, што яго жонка вучылася ў Англіі і дапаможа яму напісаць ліст.

Далей працягвае па-польску і спадзяецца, што сужэнацам прыемна было наведаць Варшаву і г. д.

«Вільня, 21 жніўня 1933 г.

Шаноўны і любы пане прафесар (Батоўскі — *Л. Л.*)!

Быў вельмі рады прыезду шаноўнага пана прафесара ў Вільню ў мінулым годзе. Я і далей падтрымліваю стасункі з Гародна, даслаў некалькі дзесяткаў фотаздымкаў, а месяц таму суправаджаў абодвух пані і іх сяброў у катэдру. Гэта было, як быццам, малое падарожжа перад шлюбам, бо п. Кандратавічоўна прыехала са сваім нарачоным, маладым Кашыцам са Сваятычаў[1]*. П. Кандратавічоўна сказала мне, што атрымала ад вас мілы ліст.*

Не ўсе мае здымкі атрымаліся, але думаю, што прыдадуцца як нататкі і дасылаю ў гэтай якасці[2]*… Яшчэ спадзяюся знайсці архіўныя матэрыялы па Гародна, але зараз не маю часу для пошукаў».*

---

[1] За якога так і не выйшла замуж.

[2] Здымкі гл. далей.

[Далей Лорэнц выказвае надзею знайсці дакументы, каб даведацца пра архітэктара маёнтка. Таксама выказвае думку наконт таго, хто мог бы быць архітэктарам палаца], *«нядаўна з архіваў удалося ўстанавіць архітэктара Агінскіх у Слоніме — гэта Бекер. Таксама ўсплылі некалькі прозвішчаў архітэктараў Сапегаў (Дзярэчын, Ружаны) ... гэта не так далёка ад Гародна».*

Станіслаў Лорэнц».

Кандратовічы, як маглі, дапамагалі пр. Батоўскаму ў падрыхтоўцы манаграфіі пра свой палац, і таму Вера зрабіла вялікую колькасць малюнкаў элементаў інтэр'еру.

Паштовая картка, рукой Ады Кандратовіч, напісана папольску.

«Пошта Гародна каля Ліды, 20.06.33.

Шаноўны пан прафесар!

Сардэчна дзякую за ліст і нататкі. Хачу выслаць пану эскізы барэльефаў, якія вельмі рупліва намалявала мая дачка, гэта была дастаткова працяглая праца...

Ада Кандратовіч».

Запіска фіялетавым атрамантам, польская мова:

«Гародна к. Ліды сакавік 10.07.1933.

Шаноўны пан прафесар, дасылаю вам малюнкі з кожнага пакоя, якія толькі ўчора закончыла маляваць мая дачка. Яна вельмі старалася і калі маюцца нейкія дыспрапорцыі ці памылкі ў памерах, іх можна паправіць, каб зразумець, як гэта ўсё выглядае. Ці трэба ёй яшчэ зрабіць нешта карыснае? Напішыце пра гэта».

Далей запрашае прафесара ў госці і піша, што будзе гэтаму вельмі рада, паведамляе, што ў жніўні ў Варшаву паедзе яе брат.

Палац з боку саду

Палац з боку дзядзінца



Палац знутры, супрапорта вялікай залы (гл. малюнак Веры Кандратовіч)

Палац знутры, супрапрота над скрадзеным люстэркам (гл. малюнак Веры Кандратовіч)



Дзверы більрдавага пакоя

Альтанка ў садзе

Капліца

Капліца, алтар

Капліца знутры, від у бок, адваротны алтару

Будуар, камінная паліца



Ружовы пакой. Залаты ўзор на белым фоне



Будуар, супрапорта ў сінім колеры



Ружовы пакой, супрапорта ў белым колеры



Будуар, супрапорты ў белым колеры.



Вялікая зала, супрапорта, малюнак на белым фоне



Вялікая зала, упрыгожванне над люстэркам, залаты ўзор на белым фоне



Бэжавы пакой, верхняя частка каміна, колер цалкам белы

Вялікая зала, супрапорта



Вялікая зала, супрапорта, малюнак золатам на белым фоне



Вялікая зала, супрапорта, аднолькавая над трыма дзвярмі



Вялікая зала, супрапорта, малюнак на белым фоне



Бэжавы пакой, супрапорта, малюнак на белым фоне



Супрапорты: 1) люстэрка над камінам вялікага зала і 2) каміннай паліцы ў ружовым пакоі



Супрапорты над каміннай поліцай і над люстэркам у будуары



Вялікая зала, супрапорты

ОГЛАВЛЕНИЕ

Жырмуны 5
Гісторыя паселішча і першыя ўладальнікі 7
Пераход маёнтка да іншых родаў 8
Радзівілаўскі перыяд 9
Заняпад маёнтка і змена ўладальнікаў 11
Будаўніцтва сядзібы і касцёла 13
Апісанне Жырмунскага двара (1784 год). Калона і статуя Арханёла Рафаіла 14
Архітэктурныя асаблівасці афіцын 17
Уязная брама ў двор Жырмуны 20
Касцёл і парафіяльнае жыццё 21
Сучасны Жырмунскі касцёл 26
Касцельныя інстытуцыі і пабудовы 29
Спіс пробашчаў 31
Лёс ксяндза Генрыка Бальцэвіча 32
Маёнтак Гародна 47
Пачаткі 49
Ганна Патоцкая з Тышкевічаў 53
Наступныя ўладальнікі Гародна 72
Сядзібны ансамбль 78
Дадаткі 109
Здымкі маёнтка, дасланыя др. Лорэнцам пр. Батоўскаму ў жніўні 1933 г. 114

Леанід Лаўрэш

«Стаяў на падмуроўцы панскі дом...»

Жырмуны і Пагародна

Создано в интеллектуальной издательской системе Ridero

У кнізе расказваецца пра два старажытныя маёнткі гістарычнай Лідчыны — Жырмуны і Пагародна. Назва кнігі — радок з першай часткі паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш».

ISBN 978-5-0071-4788-0